КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №21 (149)
◂ 12 ЧЭРВЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**ПАМІЖ ПАРТЫЯЙ І РУХАМ**
Стар. 4

**У ПОШУКАХ АЎТАРА ПЕРАМОЖНАГА СЦЭНАРУ**
«Вертыкаль» улады, створаная з мэтай рэалізацыі інтарэсаў аднаго чалавека, на справе робіцца «вертыкаллю» прыватных інтарэсаў усёй сукупнасці чыноўнікаў, якія яе складаюць
Стар. 6

**КАРОЛЬ ФІЛЬМАЎ КАТЭГОРЫІ «Б»**
У Бангкоку пры загадкавых абставінах памёр рэжысёр Дэвід Карадзін, якога лічылі каралём фільмаў катэгорыі «Б»
Стар. 13

**«НАРЭШЦЕ ЯНЫ САБРАЛІСЯ РАЗАМ»**
Беларускі павільён 53-й венецыянскай біенале на беразе Свіслачы
Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

Нарыс Аляксея Хадыкі

**Вершнікі на конях**

З цыклу «Таямніцы беларускай гісторыі»

▸ **ГЕАПАЛІТЫКА**

# ЕЎРАСАЮЗАЎСКІЯ ПЕРНІКІ

Марыя КРУК

**Еўрасаюз рыхтуецца да аднаўлення статуса адмыслова запрошанага ў Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы для Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Апеляцыя да выканання Беларуссю дванаццаці раней акрэсленых умоў ЕС набыла памяркоўны характар. Замест свабоды СМІ, спынення палітычна матываванага пераследу іншадумцаў чыноўнікі ЕС загаварылі пра адмену смяротнага пакарання. Быццам іншыя праблемы ўжо вырашаныя.**




Фота Юрыя Дзядзінкіна

На знак збліжэння з Еўрасаюзам у Мінску адкрыўся інфармацыйны пункт Рады Еўропы. Паводле слоў намесніцы генеральнага сакратара Рады Еўропы спадарыні Мод дэ Бур-Букіккія, гэта «з'яўляецца пазітыўным адказам Рады Еўропы на знакі, зробленыя кіраўніцтвам Беларусі ў бок адкрытасці і гатоўнасці да супрацоўніцтва».

На прэсавай канферэнцыі з нагоды гэтай падзеі старшыня Камітэта міністраў Рады Еўропы, міністр замежных спраў Славеніі Самуэль Жбагара паведаміў, што дэлегацыя мела шэраг сустрэчаў з высокапастаўленымі асобамі Беларусі, дзе закраналіся перспектывы дыялога і супрацоўніцтва. «Я хацеў бы заахвоціць Беларусь у рэалізацыі далейшых крокаў у адносінах выканання стандартаў Еўропы», — заявіў госць з ЕС. Таксама ён адзначыў, што спадзяецца на «праяву палітычнай волі» беларускіх уладаў у пытанні адмены смяротнага пакарання. «Адмена смяротнага пакарання — гэта пытанне не рэферэндуму, а праявы палітычнай волі з боку ўлад».

Паводле еўрапейскіх чыноўнікаў, мараторый на смяротнае пакаранне стане важным сігналам пра гатоўнасць беларускіх уладаў працягваць збліжэнне з Радай Еўропы. Пра ранейшыя патрабаванні дэмакратызацыі рэжыму прадстаўнікі Рады Еўропы амаль не ўзгадваюць. На пытанне пра палітвязняў Самуэль Жбагар каратка заўважыў, што мае надзею на вырашэнне гэтай праблемы. «Мы спадзяемся, што бліжэйшым часам праблема мусіць быць вырашаная, у тым ліку і адносна нядаўніх вязняў». Пад «нядаўнімі вязнямі» меліся на ўвазе Мікалай Аўтуховіч, Юрый Лявонаў, Уладзімір Асіпенка, якія знаходзяцца пад арыштам чатыры месяцы, і следства па іх справе працягнутае надалей. Справу ваўкавыскіх прадпрымальнікаў многія праваабаронцы лічаць палітычным пераследам.

Працяг рэформаў у галіне дэмакратыі і правоў чалавека, па словах кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Славеніі Самуэля Жбагара, дазволіць у бліжэйшай будучыні прыняць Беларусь у Раду Еўропы. Чыноўнік зазначыў, што Славенія як старшыня Камітэта міністраў Рады Еўропы «будзе прыкладаць усе намаганні, каб ажыццявіць гэту мэту». Пры гэтым ён спасылаўся на меркаванне міністраў краінаў Рады Еўропы пра «вялікі прагрэс Беларусі ў галіне дэмакратыі і павагі правоў чалавека».

Міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў аптымізм еўрачыноўнікаў цалкам падзяляе: «Сітуацыя з дэмакратыяй і правамі чалавека ў Беларусі не горш, чым у краінах-суседзях і краінах Еўрасаюза. Калі б наш парламент рыхтаваў даклад аб правах чалавека ў іншых краінах, то знайшоў бы што пакрытыкаваць». Хаця знутры краіны добра відаць, што «вялікі прагрэс» у названых сферах факталагічнага падмацавання не мае.

Еўропа старанна выдае жаданае за рэчаіснасць. Напрыклад, дакладчык па Беларусі камісіі па палітычных пытаннях ПАРЕ Андрэа Рыгоні падрыхтаваў чарговы даклад, у якім пералічвае шэраг пазітыўных зменаў (рэгістрацыю руху «За свабоду», допуск у дзяржаўныя друкарні і сетку распаўсюду газет «Народная Воля», «Наша Ніва» і «Узгорак», стварэнне кансультатыўных радаў), якія з'яўляюцца важнымі крокамі ў бок дэмакратыі і верхавенства закона. Разам з тым, ігнаруюцца факты наяўнасці ў краіне палітвязняў, у тым ліку адзінаццаці чалавек, якіх арганізацыя «*Amnesty International*» у маі прызнала вязнямі сумлення, нерэабілітацыя раней асуджаных з палітычных матываў асобаў (Аляксандр Казулін, Андрэй Кім, Сяргей Парсюкевіч і іншыя), абмежаванні на распаўсюд цэламу шэрагу недзяржаўных выданняў і многае іншае.

Нягледзячы на гэта, дакладчык прапанаваў вярнуць Беларусі статут адмыслова запрошанага, які дазваляе дэпутатам «парламента» краіны (абранага, паводле ацэнак АБСЕ, з парушэннямі заканадаўства) удзельнічаць у працы Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы. Андрэа Рыгоні паведаміў, што на сесію ПАРЕ, дзе будзе вырашацца пытанне пра вяртанне Беларусі статуса адмыслова запрошанага, прыедзе старшыня ніжняй палаты беларускага парламента Уладзімір Андрэйчанка. «Яму будзе прадстаўленая магчымасць выказаць сваё меркаванне не толькі адносна падрыхтаванага мною дакладу, але і па перспектывах далейшага развіцця адносін паміж Беларуссю і Радай Еўропы», — адзначыў дакладчык па Беларусі камісіі па палітычных пытаннях ПАРЕ.

Разам з тым Андрэа Рыгоні заявіў, што рашэнне пра вяртанне парламенту Беларусі статусу адмысловага запрошанага ў Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы «нельга разглядаць як нейкі падарунак». «Наданне гэтага статуту звязана з праверкамі на адпаведнасць стандартам Рады Еўропы. У маім дакладзе паказаныя пэўныя крытэры: мы просім, каб беларускімі ўладамі былі зробленыя наступныя крокі ў кірунку дэмакратызацыі краіны. У маім дакладзе ўстаноўлены тэрмін у адзін год для таго, каб праверыць рэалізацыю гэтых крокаў, — сказаў Рыгоні. — І гэта не проста пусты гук або балбатня, таму што Рада Еўропы і ПАРЕ хочуць бачыць пэўныя вынікі. Праз год статут адмысловага запрошанага можа быць або падоўжаны, або скасаваны па выніках праверкі».

Дакладчык ПАРЕ адзначыў, калі будзе вернуты статус адмысловага запрошанага, у працы сесій ПАРЕ будзе ўдзельнічаць не толькі афіцыйная дэлегацыя Беларусі, але і на сталай аснове дэлегацыя апазіцыі.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### МЯДЗЕЛ. ЛІДЭР ЧАРТАЎ

Гурт «Da! Бл…» з вёскі Нарач пасля перамогі на полацкім рок-фэсце «Ноч ваўкалака–2008» паабяцаў даць у «Тузін хітоў» адну з сваіх галоўных песень. Нарачанцы абяцанне стрымалі — у новым туры на «Тузіне хітоў» бярэ ўдзел іх песня «Паранойя», запісаная сёлета на Першамай у горадзе Вілейка. Музыкі прызнаюцца: самі не чакалі, што атрымаецца настолькі эмацыйна і прафесійна. «Гэта песня падабаецца абсалютна ўсім!» — кажа лідэр гурта Віктар Мароз. Гурт «Da! Бл…» быў заснаваны шэсць гадоў таму ў вёсцы Нарач Мядзельскага раёна Мінскай вобласці сябрамі-аднакласнікамі Віктарам Марозам і Віталем Ананько. Яны неаднойчы змянялі склад амаль што цалкам, гублялі ўсе магчымыя і немагчымыя рэпетыцыйныя кропкі, прадзіраліся праз дэпрэсію ды адсутнасць хоць нейкіх перспектываў, але захоўваліся як творчая адзінка і няспынна канцэртавалі. У асноўным у бліжэйшых райцэнтрах — Паставах, Мядзеле. Апошнім часам музыкі актыўна выступаюць у Вілейцы і Глыбокім. Акрамя згаданай перамогі на фэсце «Ноч ваўкалака», яны бралі ўдзел у «Рок-Калядах–2008» у Горках, запісалі дэбютны альбом пад назвай «Пачвара», а цяпер працуюць над першым паўнавартасным дыскам, які плануюць выдаць на пачатку наступнага года.

### ПАСТАВЫ. ДЫПЛАМАТЫ ЗНАЁМЯЦЦА З БЕЛАРУССЮ

Адкрыць для замежных дыпламатаў невядомую ім Беларусь — такую мэту ставіла Галоўнае ўпраўленне па абслугоўванню дыпкорпуса і афіцыйных дэлегацый Беларусі, арганізуючы для іх днямі паездку ў Пастаўскі раён. Сюды пажадалі прыехаць нават чатыры паслы з жонкамі, а таксама супрацоўнікі пасольстваў Эстоніі, Швейцарыі, Галандыі, Румыніі, Кітая, В'етнама, КНДР, Венесуэлы, Індыі, Расіі, Ірака, Венгрыі, прадстаўнікі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, МВФ і Міжнароднай фінансавай карпарацыі — усяго 67 чалавек. Знаёмства з Паазер'ем яны пачалі з аграгарадка Камаі, дзе ў касцёле пабывалі на канцэрце арганнай музыкі. Вельмі насычанай на працягу 6 гадзін была праграма іх знаходжання ў Паставах. Гасцей прыняло кіраўніцтва раёна, правяло прэзентацыю сваіх інвестыцыйных магчымасцей. Удзельнікі паездкі агледзелі ўсе славутасці райцэнтра, прагуляліся па Палацу Тызенгаўза, набярэжнай, Пастаўскім гарадскім парку, агледзелі рыначную плошчу, забудаваную ў XVIII стагоддзі, храмы, музей, Дом рамёстваў «Стары млын».

### МІР. У ЧАКАННІ КРЫСА НОРМАНА



Выступ сусветна знакамітага англійскага спевака адбудзецца ў мурах Мірскага замка апоўначы 21 чэрвеня і пройдзе ў межах серыі унікальных канцэртаў, якія адбудуцца тут з 19 па 21 чэрвеня згодна праекту «Музычныя вечарыны ў Мірскім замку». Культурная праграма разнастайная. «Опер-Мадэрн» прадставяць салісты і аркестр Нацыянальнага тэатра оперы і балета РБ: сусветная класіка ў сучаснай інтэрпрэтацыі. У гэтыя дні адбудзецца выступ Анжалікі Агурбаш з дачкою, украінскіх гуртоў «Воплі Відапласава» і «Акеан Эльзы» і шведскага «Ace of Bose». Мерапрыемствы завершацца феерверкам.

### ЛЕЛЬЧЫЦЫ. ШЧЭБЕНЬ ДАЎ ПРАЦУ

На шчэбеневы завод «Глушкавічы» паступіла пяць новых «БелАЗаў», і цяпер агулам тут налічваецца 16 адзінак гэтай айчыннай тэхнікі, з дапамогаю якой здзяйсняецца вываз горнай масы. Акрамя таго, з Германіі былі пастаўлены 2 экскаватары. Гэта паспрыяла аднаўленню працы прадпрыемства, на якім яшчэ год таму зношанасць абсталявання складала 90 працэнтаў, а рабочыя звальняліся, бо заробкі былі малыя.

Аснова прадпрыемства — кар'ер «Сялянская ніва». На дадзены момант запасы кар'ера складаюць 350 мільёнаў кубаметраў. Спецыялісты гарантуюць, што ёсць дадатковыя плошчы здабычы парод яшчэ на 216 гектараў і ў глыбіню 130 метраў.

Прадукцыя завода запатрабавана не толькі ў дарожнай, але і ў будаўнічай сферы.

### АСТРАВЕЦ. ДАПАМАГЛІ ДЗЕЦЯМ

«Зрабі крок — дапамажы нам, дапамагчы іншым». Пад такім дэвізам прайшла маладзевая акцыя «50 крокаў». У гандлёвы павільён «Мілена» людзі прыходзілі па розных прычынах: каго зацікавілі незвычайныя белыя сляды, што вялі ў краму, хто адгукнуўся на заклікі валанцёраў у майках з эмблемай Чырвонага Крыжа, яких запрашалі прыняць удзел у акцыі, а хтосьці проста зайшоў сюды за пакупкамі. Абыякавых не засталося: кожны прыняў удзел у акцыі — купіў сродак асабістай гігіены ці ахвяраваў грошы для хворых і малазабяспечаных дзетак. І сваім учынкам зрабіў кагосьці крыху шчаслівейшым. Па агульных выніках, у акцыі прынялі ўдзел больш за 300 чалавек. Сабрана 108 адзінак сродкаў асабістай гігіены і 355500 рублёў. Рэчы ўжо адправіліся дзецям, а на грошы закуплены памперсы.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

---

▸ СУД

# СПРАВА ЧАТЫРНАЦЦАЦІ

**Суд над фігурантам «справы чатырнаццаці» Максімам Дашуком пачнецца 15 чэрвеня ў 10.15 у судзе Маскоўскага раёна Мінска. Пра гэта БелаПАН паведаміла прэс-сакратар міжнароднай маладзёжнай арганізацыі «Малады фронт» Таццяна Шапуцька.**

Працэс над Дашуком павінен быў пачацца яшчэ 1 чэрвеня, аднак яго перанеслі на нявызначаны час з-за хваробы аднаго з судовых засядацеляў. Паколькі падсудны з'яўляецца непаўналетнім, яго справа, паводле закона, павінна слухацца з удзелам народных засядацеляў (адзін суддзя і два народныя засядацелі).

Нагадаем, Дашука абвінавачваюць у злачынстве, прадугледжаным артыкулам 415 Крымінальнага кодэкса Беларусі (ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі). Яму пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі. Малады чалавек быў прыгавораны да паўтара года абмежавання волі за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў у Мінску 10 студзеня 2008 года. Супрацоўнікі міліцыі неаднаразова правяралі маладога чалавека на прадмет адбывання пакарання і зафіксавалі некалькі парушэнняў — ён несвоечасова вяртаўся дамоў. Парушэнне рэжыму Дашук растлумачыў тым, што дапамагаў маці, якая працуе індывідуальным прадпрымальнікам.

23 лютага 17-гадовы Дашук быў выкліканы ва УУС Маскоўскага раёна Мінска, дзе яму выставілі абвінавачанне ў парушэнні парадку адбывання пакарання. Суткі ён правёў у следчым ізалятары № 1 на вуліцы Валадарскага, затым яго адпусцілі дадому пад падпіску пра нявыезд.

У маі 2009 года праваабарончая арганізацыя «Міжнародная амністыя» прызнала Дашука вязнем сумлення. Разам з ім вязнямі сумлення былі прызнаныя яшчэ 10 удзельнікаў «справы чатырнаццаці».

---

▸ СПРАВА

# ЭМАНУІЛ ЗЕЛЬЦЭР АБВЯСЦІЎ ГАЛАДОЎКУ

**Амерыканскі грамадзянін Эмануіл Зельцэр, які адбывае трохгадовы тэрмін зняволення ў калоніі № 15 у Магілёве, 8 чэрвеня абвясціў галадоўку.**

Як паведаміў яго адвакат Дзмітрый Гарачка, Зельцэр спрабуе прыцягнуць увагу да факта бесперспаўнага, паводле яго меркавання, зацягвання выдачы даведкі Мінскім гарадскім судом, без якой адміністрацыя калоніі не можа разгледзець пытанне пра прымяненне да асуджанага амністыі. Адвакат выказаў асцярогу, што галадоўка падарве і без таго слабае здароўе Зельцэра, які з моманту дастаўкі ў калонію знаходзіцца ў бальнічным аддзяленні.

Адміністрацыя калоніі да гэтага часу не атрымала неабходныя дакументы з Мінскага гарадскога суда аб адсутнасці іскаў у дачыненні да Зельцэра.

Адвакат лічыць, што Зельцэр трапляе пад закон аб амністыі, які быў падпісаны прэзідэнтам Беларусі 5 мая і апублікаваны 7 мая.

11 жніўня за выкарыстанне заведама несапраўдных дакументаў і замах на камерцыйны шпіянаж Эмануіл Зельцэр быў асуджаны на тры гады пазбаўлення волі. Сваёй віны ён не прызнаў. 31 кастрычніка Вярхоўны суд пакінуў прысуд у сіле. Усе судовыя працэсы прайшлі ў закрытым рэжыме.

**Паводле БелаПАН**

---

▸ ПАТРАБАВАННЕ

# АБАРОНІМ ЖЫВЁЛ

**Беларуская партыя «Зялёныя» (БПЗ) патрабуе ад Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі тэрміновага прыняцця закона, які абараняе жывёл ад жорсткага абыходжання. Такое патрабаванне ўтрымліваецца ў рэзалюцыі цэнтральнага савета БПЗ.**

Як паведаміў лідэр партыі Алег Новікаў, неабходнасць такога звароту ўзнікла ў сувязі з тым, што на мінулым тыдні на мінскім прадпрыемстве «Фауна горада», якое займаецца адловам і ўтрыманнем безнаглядных жывёл, праведзена масавае ўсыпленне сабак. Большасць жывёл былі здаровыя, прышчэпленыя і знаходзіліся пад пастаяннай апекай валанцёраў.

Паводле інфармацыі, кіраўніцтва прадпрыемства мае намер праводзіць падобныя ўсыпленні пастаянна. Жывёлы, якія да іх трапляюць, будуць утрымлівацца мінімальна ўстаноўлены тэрмін.

«У апошнія месяцы назіраецца сур'ёзнае пагаршэнне ўмоў утрымання жывёл, якія трапляюць на прадпрыемства. Кіраўніцтва «Фауны горада» абмяжоўвае доступ да жывёл валанцёраў, якія спрабуюць добраахвотна і за ўласныя сродкі палегчыць іх пакуты», — гаворыцца ў рэзалюцыі БПЗ.

Партыя патрабуе гуманізацыі прававой сістэмы адлову і ўтрымання безнаглядных жывёл. «Для гэтага адпаведныя службы павінны, перш за ўсё, як мага хутчэй быць выведзены з сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у сілу спецыфікі якой жывыя істоты разглядаюцца толькі як смецце, якое трэба знішчыць», — лічыць Новікаў.

Паводле яго слоў, БПЗ гатова распрацаваць праект такога закона і перадаць яго ў Палату прадстаўнікоў і цэнтр па заканатворчай дзейнасці пры Адміністрацыі прэзідэнта. «Я спадзяюся, што гэты законапраект будзе гатовы да восеньскай сесіі парламента», — сказаў Алег Новікаў.

Партыя «Зялёныя» таксама заклікае ўсіх неабыякавых грамадзян забраць жывёл з прытулку «Фауна горада», каб забяспечыць ім нармальныя ўмовы існавання.

---

# ПАМЯЦІ УЛАДЗІМІРА ФУРСА

**У сваім доме ў Калодзішчах раптоўна памёр доктар філасофіі Уладзімер Фурс.**

Філасофія сталася ягоным жыццём. Яму было 45 гадоў. Доўгі час ён загадваў кафедрай філасофіі, магістэрскай праграмай «Сацыяльная тэорыя і палітычная філасофія» Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта (ЕГУ). Апошнім часам быў кіраўніком даследчага Дэпартамента ЕГУ. Быў ён надзеяй ЕГУ, адным з вядучых выкладчыкаў. Многія меркавалі, што ён стане пераемнікам акадэміка Анатоля Міхайлава на пасадзе рэктара універсітэта.

Уладзімір Фурс нарадзіўся ў Наваполацку ў 1963 годзе. У 1985-м скончыў аддзяленне філасофіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у 1989-м абараніў кандыдацкую дысертацыю. У 1988–2002 гадах працаваў на кафедры філасофіі і метадалогіі навукі філасофска-эканамічнага факультэта БДУ. У 2002-м абараніў доктарскую дысертацыю ў Санкт-Пецярбургскім дзяржаўным універсітэце. З 2002 года — прафесар ЕГУ, з сакавіка 2009 — загадчык сектарам навуковых даследаванняў ЕГУ. Стваральнік і кіраўнік магістэрскай праграмы «Сацыяльная тэорыя і палітычная філасофія», ініцыятар і кіраўнік шэрагу рэгіянальных і міжнародных навукова-даследчых і адукацыйных праектаў. Аўтар чатырох манаграфій і больш ста публікацый на беларускай, рускай, украінскай, ангельскай, літоўскай, французскай мовах. Лідэр новага для айчыннай думкі кірунку сацыяльнай тэорыі, які ўнёс значны ўнёсак у развіццё філасофіі і сацыяльных навук Беларусі і рэгіёна.

Рэдакцыя газеты «НЧ» выказвае шчырае спачуванне родным і сваякам Уладзіміра Фурса.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГАЛОЎНАЕ — НЕ ПАЛОХАЦЦА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Апошнія падзеі ў краіне неяк вельмі выглядаюць на тое, што наш усходні «брат» імкнецца папросту запалохаць наш «крыштальны сасуд». Тут можна параіць толькі адно — не палохацца.**


Photo.ByMedia.Net

Па-першае, гучны рэзананс выклікала заява кіраўніка Генштаба Расіі Мікалая Макарава пра тое, што Расія ўвядзе ў верасні на тэрыторыю Беларусі дзве арміі ў поўным складзе. Нібыта для ўдзелу ў манеўрах «Захад–2009». Шухер з-за гэтай заявы паднялі ўсе. Аргкамітэт па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» ў асобе сустаршыні Віталя Рымашэўскага заявіў, што ўвод расійскіх армій у Беларусь — рэальная пагроза незалежнасці краіны.

Большае заявіў Звяз беларусаў Германіі. Ягоны старшыня Яўген Мурашка падлічыў колькасць расійскіх войскаў у параўнанні з беларускімі. І прыйшоў да высновы, што расійскія войскі па колькасці салдатаў, баявой і тэхнічнай моцы перавышаюць усю беларускую армію. «Штатны расклад 58-й расійскай арміі, якая ўдзельнічала ў мінулагоднім канфлікце з Грузіяй, — гэта 80000 ваенных, 609 танкаў, 380 установак «Град», 120 самалётаў, 2000 БМП і БТР, 70 верталётаў, 125 мінамётаў і гармат, 450 зенітных сістэм», — зазначыў Мурашка. А, па ягоных дадзеных, уся беларуская армія складаецца толькі з 65 тысяч вайскоўцаў, з якіх 15 тысяч — цывільны персанал.

«Узнікае пытанне: для чаго трэба такая колькасць замежных войскаў на нашай тэрыторыі? «Саюз беларусаў Германіі» лічыць, што правядзенне вучэнняў у такім складзе патэнцыйна нясе ў сабе пагрозу акупацыі Беларусі. Досыць спраўакаваць любы інцыдэнт з удзелам расійскіх ваенных, каб расійская армія засталася ў Беларусі назаўжды пад маркай забеспячэння бяспекі расійскіх грамадзян», — адзначыў Яўген Мурашка.

Толькі пасля гэтага розгаласу прэс-служба Міністэрства абароны Беларусі вымушана была заявіць, што ў манеўрах «Захад–2009» будуць удзельнічаць агульным лікам 13 тысяч вайскоўцаў. З іх расійцаў 4–5 тысяч.

Больш за тое, па меркаванні ваеннага эксперта Аляксандра Алесіна, у Расіі ўвогуле не набярэцца дзвюх баяздольных армій, і само гэта паняцце там аджывае. Рэформа расійскага войска палягае ў тым, што адмаўляюцца ад армій і пераходзяць на структуру «брыгада — корпус — камандаванне».

Так што хтосьці нас палохае, а навошта — невядома.

На тыдні таксама з'явіліся новыя пагрозлівыя чуткі. Федэральная служба па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека Расіі (Расспажыўнагляд) мае намер забараніць увоз яшчэ 800 найменняў беларускай малочнай прадукцыі ў дадатак да раней забароненых 500 відаў.

«Як паказаў дадатковы аналіз, выкананне тэхрэгламенту на малако і малочную прадукцыю, перааформленне дакументаў на тэрыторыі Смаленскай і Бранскай абласцей праводзілася з відавочным парушэннем падобнага кшталту працэдур», — паведаміў *«РИА Новости»* кіраўнік службы Генадзь Анішчанка.

Паводле яго слоў, у выніку будзе адклікана 406 санітарна-эпідэміялагічных заключэнняў, выдадзеных або перааформленых для беларускай прадукцыі ў Бранскай вобласці. Такі ж лёс чакае 107 заявак на беларускую малочную прадукцыю, якія ўнесены расійскімі пастаўшчыкамі ў Бранскай вобласці.

Што тычыцца Смаленскай вобласці, то, як паведаміў Анішчанка, пастаўкі, ажыццёўленыя па 198 выдадзеных дазволах, будуць прыпыненыя, яшчэ 92 дакументы, што знаходзяцца ў лісце чакання, будуць адкліканыя.

«На гэты час практычна ўся малочная беларуская прадукцыя забаронена для ўвозу ў Расію», — сказаў Анішчанка. Паводле яго слоў, цяпер забарона распаўсюджваецца на прадукцыю больш як тысячы найменняў, «за выключэннем 50–60 пазіцый».

Але ж у агульнай структуры «малочнага» экспарту пастаўкі на расійскі рынак займаюць толькі 4–5 працэнта. Больш за тое, як сказаў эканаміст Леанід Злотнікаў, экспарт малочнай прадукцыі ў Расію і так быў стратным. «Толькі Мінская вобласць у першым квартале гэтага года панесла 64 мільярда рублёў стратаў. Пры сабекошце 4,6 долара мы прадаём масла ў Расію за 2,8 долара за кілаграм. Гэта значыць, гандлюем сабе ў страту. Таму ў доўгатэрміновай перспектыве нам выгадней вырабляць менш малочна-мясной прадукцыі», — лічыць Злотнікаў.

Такім чынам, не такі страшны чорт, як яго намалявалі.

Тым больш, што істэрыка, паднятая вакол нязгоды Расіі даваць Беларусі другі транш крэдыту ў памеры 500 мільёнаў долараў, вельмі хутка скончылася. Крэдыт Беларусі можа быць выдзелены са сродкаў антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС. Пра гэта 9 чэрвеня заявіў журналістам у Маскве віцэ-прэм'ер, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын. Адказваючы на пытанне пра магчымасці прадстаўлення Мінску такога крэдыту, ён сказаў: «Усе варыянты разглядаюцца». Паводле слоў Кудрына, антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС будзе створаны на працягу найбліжэйшых двух месяцаў. «Як толькі ўсе краіны ратыфікуюць гэта рашэнне, фонд пачне сваю працу», — заявіў ён.

Больш нам трэба непакоіцца з-за нашых дзеянняў і нашых ініцыятываў. Бо мы самі выбралі «Росатамэнерга» ў якасці будаўніка Беларускай АЭС. Зараз узнікаюць праблемы. Атамны рэактар, які прапаноўвае Расія для беларускай АЭС, лічыцца небяспечным. Пра гэта сказаў кандыдат тэхнічных навук, эксперт Міжнароднай сацыяльна-энергетычнай супольнасці (Масква) Ігар Шкрадзюк. Ён з'яўляецца адным з аўтараў манаграфіі «Зніжэнне спажывання прыроднага газу ў Беларусі: ядзерны і інавацыйны сцэнарый».

Паводле слоў эксперта, расійскім бокам прапаноўваецца для будаўніцтва «вядомая канструкцыя корпуснага рэактара, які вырабляецца для АЭС з 1960-х гадоў, і, нягледзячы на пэўныя тэхнічныя змяненні, такая канструкцыя ўсё роўна дапускае выбух». Эксперт таксама нагадаў, што ў 1985 годзе якраз на корпусным рэактары адбылася аварыя на падводнай лодцы ў бухце Чажма. Выбух адбыўся падчас планавага спынення рэактара для замены ядзернага паліва. «А планавае спыненне рэактара будучай беларускай АЭС непазбежнае. Такая яго асаблівасць», — адзначыў ён.

Так што пакуль яшчэ не позна перадумаць наконт будаўніцтва АЭС у Беларусі ўвогуле.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ


Фота Юрыя Дзядзінкіна

### ВЯЧАСЛАЎ СІЎЧЫК

Грамадскі дзеяч Вячаслаў Сіўчык узначаліў аргкамітэт руху салідарнасці «Разам». У арганізацыйным пасяджэнні новастворанага руху прынялі ўдзел 57 дэлегатаў з Мінска і рэгіёнаў. Сваю дзейнасць рух збіраецца накіраваць на падтрымку беларускіх прадпрымальнікаў і «супрацьстаянне этнацыду беларусаў». Таксама рух салідарнасці «Разам» прыме ўдзел у Кангрэсе Еўрапейскага выбару, які адбудзецца 21 чэрвеня 2009 года ў Мінску. Заснавальнікі руху аднагалосна вырашылі зарэгістраваць арганізацыю ў любой краіне, «дзе дзейнічае правы і паважаюцца правы чалавека». Зыходзячы з кантэксту рашэння, арганізатары не будуць спрабаваць зарэгістраваць рух у Беларусі. Намеснікамі Вячаслава Сіўчыка абраныя прадпрымальніцкі лідэр Аляксандр Макаеў і грамадскі дзеяч Аляксандр Мазур.

### АЛЕСЬ КАМОЦКІ


Фота Юрыя Дзядзінкіна

Бард Алесь Камоцкі адзначыў свой 51-ы дзень народзінаў канцэртнай прэзентацыяй новага альбому «З бацькоўскай кружэлкі». Альбом складаецца з папулярных за савецкім часам песень, перакладзеных і выкананых па-беларуску Алесем і яго музыкамі. Упершыню прыхільнікі спевака змаглі пачуць па-беларуску такія хіты, як *«Старый клён», «Утомлённое солнце», «Одинокая гармонь»*, а таксама народныя песні *«Чёрный ворон»* і *«Шумел камыш»*. У дадатак да музычнага дыску альбом утрымлівае асобны дыск з беларускамоўным відэа-караоке да ўсіх песень. «За апошні час мне стала падабацца граць з музыкамі! — заўважае бард. — Я ўсё жыццё рабіў усё самастойна, але зараз — зусім іншая справа! Хачу таксама сказаць, што на шостым дзесятку я адчуваю, што жыццё толькі пачынаецца. Ніякага рубяжа ці раптоўнай мяжы… Вось памятаеце, як раней казалі: «Да майскіх мы паспеем гэта, а да акцябрскіх — гэта. І ўсё, мы перамаглі, мы паспелі да майскіх… скасіць капусту»? Дык гэта ўсё ўмоўнасці! Вось і дзесяткі — таксама ўмоўнасці. Галоўнае тое, як ты сябе адчуваеш!» На святочным канцэрце народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, віншуючы Камоцкага, заўважыў, што ў Алеся саамы актуальны ўзрост для жаніцьбы. На гэта бард адказаў наступнае: «Як знайду што талковае, то ажанюся, а пакуль — не».

### БЕРНАРД ШТАНГЕ



Пад кіраўніцтвам трэнера Бернарда Штангe зборная Беларусі па футболе атрымала трэцюю перамогу ў адборачным турніры Чэмпіянату свету–2010. Падапечныя Штангe выйгралі ў каманды Андоры з лікам 5:1. «Вельмі цяжка было гуляць супраць каманды, якая толькі абараняецца, — адзначыў галоўны трэнер зборнай Беларусі на прэс-канферэнцыі пасля матчу. — Я сказаў футбалістам быць гатовымі да цярплівай гульні, дзейнічаць спакойна і чакаць, пакуль Андора зламаецца. Гэта адбылося, і хуткі гол на другой хвіліне нам дапамог». Штангe адзначыў, што па матчы з Андорай нельга меркаваць пра цяперашнюю сілу. «Мы проста выканалі свой абавязак, перамогшы Андору. Наша мэта — выйграць хатнія матчы з Харватыяй, Украінай і Казахстанам, і тады сітуацыя ў групе можа быць цікавай. Мне шкада, што нам патрапілася моцная група. Калі б пры лёсаванні былі большыя поспехі, у нас было б больш шанцаў у барацьбе за выхад на Чэмпіянат свету», — лічыць галоўны трэнер зборнай Беларусі па футболе. Цяпер Беларусь знаходзіцца на трэцім месцы ў сваёй адборачнай групе ў кваліфікацыі да чэмпіянату свету. Пад кіраўніцтвам Штангe Беларусь выйграла ў Казахстана — 3:1, Андоры — 5:1, прайграла англічанам і ўкраінцам. Наступную сустрэчу адборачнага цыкла да Чэмпіяната свету 2010 года нашы футбалісты згуляюць 12 жніўня ў Мінску супраць харватаў. Для Штангe матч з Андорай быў соты па ліку. Ён трэніраваў зборныя ГДР, Аману, Іраку і Беларусі. Пад кіраўніцтвам Бернарда Штангe зборная Беларусі займала самы высокі рэйтынг ФІФА — 57-е месца

**Падрыхтавала Вольга Хвоін**

**НОВАЯ ХВАЛЯ**

# ПАМІЖ ПАРТЫЯЙ І РУХАМ

**Юрась Губарэвіч добра ўпісваецца ў хвалю «новых палітыкаў» — адпаведнасць па ўзросту, адукацыі, досведу і, урэшце, амбіцыях. У палітычных колах ён стаў вядомы пасля выбарчай кампаніі 2003 года — тады Юрась набраў большасць галасоў у Белаазёрскім гарсавеце і стаў намеснікам старшыні савета. Узначальваў штаб Брэсцкай вобласці экс-кандыдата Аляксандра Мілінкевіча, праз два гады стаў намеснікам старшыні партыі БНФ. Праўда, не без пярэчанняў: кіраўніцтва БНФ мела прэтэнзіі да шчыльнага сяброўства і супрацоўніцтва з новастворанным рухам «За свабоду». Летась малады намеснік за тыя ж «грахі» ледзь не патрапіў пад махавік зачыстак партыйных шэрагаў. Але ўсё яшчэ трымаецца на плыву. З Юрасём Губарэвічам, асоба якога засвяцілася і сярод падпісантаў «Маніфеста» — кааліцыі маладых і актыўных размаўляе Вольга Хвоін.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

***— Як атрымалася, што сярод падпісантаў гэтага «Маніфеста» аказаліся прадстаўнікі розных палітычных і грамадскіх структур?***

— Подпіс пад «Маніфестам» не азначае, што людзі адмаўляюцца ад удзелу ў жыцці сваіх арганізацый, партый. Іх пазіцыя ў значнай ступені будзе адлюстроўваць пазіцыю іх арганізацый. Адразу было агучана, што гэта ёсць аб'яднанне асобаў, а не структур. Што тычыцца згадвання асобы Аляксандра Мілінкевіча, то сёння гэта чалавек, які атаясамлівае палітыку, скіраваную на збліжэнне з Еўрасаюзам. Ён бачыць, што гэта збліжэнне выгадна Беларусі не толькі ў часовым, але і гістарычным кантэксце. Мы такую пазіцыю падтрымліваем. Але, падкрэслю, гэта не знак таго, што ўсе падпісанты «Маніфеста» збіраюцца працаваць на выбарчую кампанію Мілінкевіча. Настроі абсалютна розныя. Ёсць і такія, хто плануе ладзіць свае грамадскія кампаніі, але гэта не будзе праца ў штабах.

***— Моладзевыя рухі і арганізацыі маюць выразную схільнасць да расколаў, драблення. А тут — кааліцыя...***

— Расколы, на маю думку, адбываюцца з-за супрацьстаяння асобаў унутры арганізацыі. Пытанне ва ўнутранай дэмакратычнай культуры. Праблему варта вырашаць шляхам перавыбараў, але адбываецца адколванне пэўнай часткі арганізацыі з новым лідэрам, які, магчыма, ужо і дарос да таго, каб мець такое званне, гатовы павесці за сабой людзей. Сярод падпісантаў «Маніфеста», як можна заўважыць па персаналіях, ёсць людзі, якія ў рамках адной арганізацыі канфліктавалі. Калі б ім патрэбна было аб'ядноўвацца і абраць лепшага, то наўрад ці яны змаглі б гэта зрабіць. Але працаваць у прапанаваным фармаце каардынацыі дзеяннеяў пагаджаюцца.

***— І чаго чакаць ад «новай хвалі» бліжэйшым часам?***

— Цяпер ідуць кансультацыі, распрацавана некалькі супольных кампаній. Напрыклад, «Быць беларусамі», за сямейныя каштоўнасці, еўрапейскі выбар. Мы заўважылі, што падпісанты «Маніфеста» збольшага працавалі ў падобных накірунках, але аўтаномна. Спадзяемся, што скардынаванасць узмоцніць эфект. Акрамя таго, арганізацыя Беларускага еўрапейскага форума таксама збольшага ўскладаецца на нас. Цяпер стаіць задача прыцягнуць як мага большую колькасць людзей да ўдзелу, звярнуць увагу грамадства і, натуральна, якасна правесці само мерапрыемства. Хачу падкрэсліць, што мы — не кааліцыя, якая бярэ на сябе адказнасць за ўсё, што адбываецца ў розных сферах. Мы выступаем за рознабаковае развіццё. Скажам, партыі пад лідэрствам старэйшых палітыкаў таксама маюць права сябе праяўляць.

***— Вясной арганізатары традыцыйных вулічных акцый запрашалі далучыцца да працэсу іх падрыхтоўкі менавіта палітыкаў, грамадскіх дзеячаў з новай хвалі. Чаму мы не пабачылі іх лідэрскіх здольнасцяў на справе?***

— Масавыя акцыі пратэсту на сёння сябе зжылі. Нельга казаць, што, калі б за арганізацыю вясновых акцый узяліся прадстаўнікі новага пакалення, атрымалася б нешта кардынальна іншае. На сёння аб'ектыўна такія формы не падтрымліваюцца людзьмі. Трэба не наступаць на старыя граблі, а шукаць новыя формы. Тое, што, скажам, прапануе Беларуская хрысціянская дэмакратыя, рух «За свабоду» — апеляцыя да каштоўнасцяў, якія падзяляюць людзі, — будзе знаходзіць значна большы водгук у людзей.

***— На 20 чэрвеня прызначаны сход партыі БНФ, на якім будзе вырашацца пытанне, што рабіць з прыхільнікамі руху «За свабоду». Чаго чакаеце на выхадзе?***

— Гэты сход — прыватная ініцыятыва старшыні партыі БНФ Лявона Баршчэўскага. Рашэнні сходу не могуць быць абавязковымі для партыі. Больш за тое, гэтая ініцыятыва прынятая насуперак рашэнню Сойма партыі БНФ, на якім яна была адхіленая. Натуральна, старшыня партыі можа склікаць сваіх прыхільнікаў і размаўляць з імі. Але ўсе рашэнні падобных сходаў — выключна прыватная думка старшыні і тых, хто трымаецца яго пазіцыі. На гэтым сходзе будзе разгледжана некалькі пытанняў. Адно з іх — пра ўдзел партыі БНФ у наступнай прэзідэнцкай кампаніі. Спадар Баршчэўскі з'яўляецца адным з дванаццаці кандыдатаў, якіх вылучылі нашы рэгіянальныя структуры. Папярэдне разглядаліся кандыдатуры Сяргея Мальчыка, Ігара Лялькова, які атрымаў найбольшую падтрымку на папярэднім этапе вылучэння, Івана Шэгі, Сяргея Антусевіча, Аляксандра Меха, Сяргея Салаша, Тэльмана Маслюкова, Рыгора Кастусёва, Змітра Салаўёва, Леры Сом, Юрыя Хадыкі. На маю думку, гэта адлюстроўвае, што ў БНФ цяпер няма яўнага лідэра.

На гэтым фоне Лявон Баршчэўскі праз правядзенне такога сходу спрабуе ўзурпаваць магчымасць вылучэння ад БНФ. Насуперак рашэнню кіруючых органаў, без яснай працэдуры, ён хоча рашэнне сваіх прыхільнікаў выдаць за рашэнне партыі. Таксама ў праграме разгляд узаемадачыненняў з іншымі палітычнымі суб'ектамі. Папярэдняя ініцыятыва Баршчэўскага наконт таго, што мусіць быць жорсткі падзел паміж партыйцамі і тымі, хто ўваходзіць у рух «За свабоду», а апошнія мусяць выйсці з партыі, не было ўхвалене Соймам. Не ведаю, ці будзе гэтае пытанне зноў падымацца.

***— Калі ўсё ж будзе прынятае рашэнне, што сябры партыі БНФ не могуць удзельнічаць у працы руху, асабіста вы які бок абярэце?***

— Такая пастаноўка пытання абсалютна штучная. Сёння легітымнага рашэння на гэты конт няма. Але, зноў-такі, я маю падтрымку большасці дэлегатаў з'езда, якія галасавалі за абранне мяне ў якасці намесніка старшыні ў снежні 2007 года. Тады была вялікая дыскусія наконт маёй супрацы з рухам. Я выйшаў да дэлегатаў і патлумачыў, што не бачу тут супярэчнасцяў, і акурат шчыльнае ўзаемадзеянне з рухам і Аляксандрам Мілінкевічам узмацніць партыю. Такую пазіцыю падтрымалі сябры партыі і абралі мяне намеснікам. Не лічу, што асабістае меркаванне кіраўніцтва партыі, асобных яе сяброў больш важкія, чым рашэнне з'езда. Калі будзе іншая пазіцыя дэлегатаў з'езда ў верасні, я буду вымушаны зрабіць выбар. Цяпер такой неабходнасці няма.

***— Паўсюль ідуць размовы наконт будучай выбарчай кампаніі. Для сябе вызначыліся, з якім кандыдатам будзеце працаваць?***

— Думаю, што такое рашэнне буду прымаць бліжэй да выбараў і фармавання штабоў. Тое, што цяпер Мілінкевічу закідаюць нібыта працу арганізацыі штабоў, не адпавядае рэчаіснасці. У руху «За свабоду» няма рашэння пра вылучэнне ўласнага кандыдата, але Мілінкевіч як палітык мае права заяўляць пра свае памкненні. На маю думку, калі Мілінкевіч пойдзе на прэзідэнцкія выбары, ён не будзе абапірацца выключна на структуры руху. Хутчэй за ўсё, ён пойдзе шляхам фармавання кааліцыі, у якую ўвойдуць шэраг палітычных арганізацый. Думаю, шанец і час для партыі БНФ вылучыць і раскруціць свайго кандыдата бяздарна ўпушчаны. Мы распачалі гэтую працэдуру яшчэ леташняй восенню, а гэтай вясной мусіў быць названы кандыдат. Але ўсё было сабатавана перадусім Управай партыі БНФ. Баршчэўскі як кіраўнік Управы нічога не зрабіў для легітымнага вылучэння кандыдата. Цяпер называць некага кандыдатам ужо позна. Сілаў партыі — і рэсурсных, і асабовых — каб правесці якасную кампанію недастаткова. Пошук ворагаў — адзіная праца, якую рэалізоўваў унутры БНФ цяперашні старшыня пасля свайго абрання — моцна падкасіў шэрагі партыйцаў. Перспектыў стварэння кааліцыі я не бачу, бо ў партыі няма адпаведнага пагаднення ні з адной структурай, блізкай па духу партыі.

***— І ўсё ж, чаго не хапала ў партыі, і што знайшлі для сябе ў руху?***

— Я быў кіраўніком выбарчага штаба Мілінкевіча ў 2006 годзе. І, аналізуючы, як складаліся сілы на карысць кандыдата, няцяжка было заўважыць, што сябры палітычных партый свае рэсурсы выкарыстоўвалі прыблізна напалову. Значную частку подпісаў сабралі беспартыйныя, недзе дваццаць працэнтаў — з розных грамадскіх аб'яднанняў. Гэта для мяне і было правобразам руху «За свабоду», эфектыўнай схемай дзейнасці. З гэтай ідэяй я прыйшоў у рух, прапанаваў яе Аляксандру Мілінкевічу, і ў гэтым накірунку мы працуем. Перад рухам стаіць некалькі мэтаў, пасля дасягнення якіх, магчыма, патрэба ў ім адпадзе. Перадусім дамагчыся правядзення свабодных выбараў, сталага пераходу да дэмакратычнага шляху развіцця і захавання незалежнасці. Рух — не палітычная партыя, якая мусіць змагацца за ўладу.

***— Але просты шлях да гэтага — самому стаць уладай...***

— Гэта адзін са шляхоў. Іншыя — грамадскі пратэст, ціск грамадства. Змены могуць быць не толькі знутры, але і пад ціскам звонку. Скажам, эканамічная сітуацыя будзе прымушаць рэжым шукаць супрацоўніцтва не толькі з Расіяй, але і з Еўрапейскім саюзам. І адтуль мусяць быць дакладныя сігналы, што такое супрацоўніцтва можа быць толькі з умоваю глыбокіх дэмакратычных пераўтварэнняў.

***— Апошнім часам вакол асобы лідэра руху «За свабоду» Аляксандра Мілінкевіча разгарэлася цэлая інфармацыйная вайна. Адкуль ногі растуць?***

— У гэтым ролю адыгрываюць некалькі фактараў. Першае — пачатак барацьбы прэтэндэнтаў на ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах. Магчыма, са штабоў патэнцыйных кандыдатаў ідуць замовы, каб прыбраць канкурэнта. Прычым па нехарактэрных для Беларусі тэхналогіях — паліванне брудам, адсутнасць канкрэтных фактаў. Другое — на жаль, значная частка палітыкаў разгубіліся ў новых варунках, яны не разумеюць, як паводзіць сябе ў сітуацыі, калі Лукашэнка пачынае перамовы з Еўропай. Іх роля страчваецца. Гэта частка апазіцыі будзе мець маральную падтрымку ЕС, але не зможа ўплываць на сітуацыю. Многія заяўлялі, што з'яўляюцца прыхільнікамі еўраінтэграцыі, гісторыя дае ім шанец. На маю думку, дэмакратычны электарат не хвалююць праблемы выжывання асобных палітыкаў, іх хвалюе выжыванне краіны. Людзей, якія выступаюць супраць рэжыму, па розных ацэнках, 20–25 працэнтаў, тых, хто выступае за еўрапейскі выбар Беларусі — каля 35 працэнтаў. Але, калі ўзяць падтрымку ўсіх апазіцыйных партый, то лічбы ў разы меншыя. Чаму партыі не могуць выйсці на гэтых людзей, атрымаць іх ухваленне? Бо заклапочаныя ўласным выжываннем, а не працай.

ПАДТРЫМКА

# СУСВЕТНЫ БАНК ВЕРЫЦЬ БЕЛАРУСІ

Вольга ХВОІН

**Беларусь атрымала ад Сусветнага банку (WB) пазыку ў 125 мільёнаў долараў на рэалізацыю праектаў па павышэнню энергаэфектыўнасці. Сусветны банк разглядае магчымасць павелічэння фінансавай падтрымкі Беларусі.**

Крэдытную дамову ў прысутнасці журналістаў падпісалі старшыня дзяржаўнага Камітэта па стандартызацыі Беларусі Валерый Карашкоў, з боку Сусветнага банка — дырэктар аддзела Украіны, Беларусі і Малдовы Сусветнага банка Марцін Райзер. Гэта самая буйная пазыка, якая быў прадстаўленая Беларусі за ўвесь час супрацоўніцтва краіны з Сусветным банкам. Рашэнне аб прадстаўленні пазыкі было прынятае Радай выканаўчых дырэктараў WB 28 мая.

Грошы будуць накіраваныя на рэалізацыю праектаў па павышэнню энергаэфектыўнасці пры вытворчасці цяпла і электраэнергіі ў шэрагу гарадоў Беларусі. Агулам праект уключае шэсць падпраектаў: два ў сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі і чатыры ў галіне энергетыкі. Пасля ўстаноўкі сучаснага газатурбіннага абсталявання і газаматораў будзе атрымана каля 90 МВт дадатковай электрычнай магутнасці. Чакаецца, што эфектыўнасць вытворчасці цяпла і электраэнергіі на аб'ектах праекту павялічыцца на 30 працэнтаў. Паводле папярэдніх падлікаў, штогод Беларусь зможа эканоміць каля 90 мільёнаў кубічных метраў прыроднага газу, што эквівалентна 13 мільёнам долараў у бягучых коштах на імпарт.

Станоўчы эфект чакаецца і для экалогіі: на 165 тысяч тон у год скароцяцца выкіды ў атмасферу аксіду вугляроду. Пазыка Сусветнага банка прадстаўляецца на ўмовах пагашэння на працягу шаснаццаці гадоў з адтэрміноўкай выплаты асноўнай сумы пазыкі на шэсць год. Рэалізацыя праекта пачнецца сёлета і зойме пяць год.

Дырэктар па стратэгіі і аперацыях Сусветнага банка Тэд Алерс падчас брыфінга заявіў, што, выдаўшы пазыку, WB тым самым пацвердзіў свой давер да Беларусі. «Сусветны банк не выдае пазыкі тым кліентам, якіх лічыць неплацёжаздольнымі. Сусветны фінансава-эканамічны крызіс аказаў уздзеянне на Беларусь гэтак жа, як і на іншыя краіны. На пачатку года ўлады прынялі эканамічную палітыку, якая была скіраваная на рашэнне кароткатэрміновых наступстваў крызісу», — зазначыў эксперт.

Цяпер разглядаюцца магчымасці павелічэння фінансавай падтрымкі Беларусі. «Мы абмяркоўваем з урадам Беларусі эканамічную палітыку, якая дазволіць краіне пасля завяршэння сусветнага крызісу аднавіць эканамічны рост і ўстойліва развівацца. У залежнасці ад дамоўленасцяў будзе прынятае рашэнне пра пашырэнне як тэхнічнай, так і фінансавай падтрымкі Беларусі, — паведаміў Тэд Алерс. — Мы хацелі б умацаваць наша супрацоўніцтва, і цяпер разглядаецца пытанне аб пашырэнні нашай дзейнасці ў Беларусі як у частцы аналітычнай працы, так і ў частцы павелічэння фінансавання падтрымкі».

Сярод умоў вылучэння пазыкі, якія акрэслівае Сусветны банк, тры асноўныя пункты: эфектыўнасць бюджэту на макраэканамічным узроўні, павышэнне адраснасці сацыяльнай падтрымкі і шэраг крокаў па павышэнню прывабнасці інвестыцыйнага клімату як для ўнутраных, так і замежных інвестараў. Мэта прыцягнення такіх інвестыцый — павялічыць колькасць працоўных месцаў і павысіць узровень жыцця грамадзян краіны. Цяпер ідуць перамовы аб канкрэтных мерапрыемствах у названых накірунках.


Фота Юрыя Дзядзінкіна
Марцін Райзер і Валерый Карашкоў

Сусветны банк перагледзіць чатырохгадовую стратэгію па Беларусі, зацверджаную два гады таму. У рамках гэтай стратэгіі было прадугледжана вылучэнне Беларусі не больш за сто мільёнаў долараў у год. «Мы разглядаем магчымасць павелічэння гэтай сумы. Яе памер будзе залежаць ад таго, якую суму беларускі ўрад хацеў бы мабілізаваць», — паведаміў дырэктар па стратэгіі і аперацыях Сусветнага банка. Дакладную суму магчымай далейшай фінансавай дапамогі Тэд Алерс назваць адмовіўся.

Пры гэтым дырэктар аддзела Украіны, Беларусі і Малдовы Сусветнага банка Марцін Райзер адзначыў, што размова ідзе не пра зацвярджэнне новай стратэгіі, а пра карэкціроўку дзеючай. Таксама ён падкрэсліў неабходнасць стварэння ў Беларусі больш прывабных умоў для прыцягнення замежных інвестыцый: «Запазычанасць Беларусі на ўзроўні 13 працэнтаў ВУП не такая высокая. Іншая справа, што пасля завяршэння фінансавага крызісу прыток замежных інвестыцый не будзе такі, як у дакрызісны перыяд. Таму цяпер задача клапаціцца пра паляпшэнне інвестыцыйнага клімату. Хацелася б, каб Беларусь думала не толькі пра прыцягненне знешніх запазычанасцяў, але і пра правядзенне структурных рэформаў, якія дазволяць зрабіць больш прывабным інвестыцыйны клімат, эфектыўна выкарыстоўваць замежны капітал».

ПАМЯЦЬ

# КУРАПАЦКІЯ АХВЯРЫ НАБЫЛІ СПАКОЙ

Генадзь КЕСНЕР

**Увечары 10 чэрвеня ў Курапатах адбылося перапахаванне парэшткаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсій, якія былі выкапаныя невядомымі вандаламі ў красавіку бягучага года. Экспертыза паказала, што парэшткі належаць пяці чалавекам і датуюцца 1937–1941 гадамі.**



У палове на сёмую вечара ў Курапацкім лесе сабраліся некалькі дзесяткаў грамадскіх актывістаў, каб аддаць даніну памяці людзям, закатаваным у гэтым месцы сталінскімі апрычнікамі ў 1937–1941 гадах мінулага стагоддзя.

Як распавёў старшыня Таварыства аховы помнікаў Антон Астаповіч, на пачатку красавіка бягучага года невядомыя вандалы незаконна ўскрылі ў Курапатах два магільнікі, на адным з іх была даволі вялікая колькасць косных парэшткаў, якія ў ходзе крымінальнае справы, узбуджанай па факце акта вандалізму, былі вынятыя для правядзення суднова-медыцынскай экспертызы.

«На мінулым тыдні са мною звязаліся супрацоўнікі аддзелу папярэдняга дазнання Мінскага абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў і папрасілі забраць парэшткі, над якімі праводзілася экспертыза, для іх далейшага перапахавання, — кажа Антон Астаповіч. — Са слоў супрацоўнікаў абласнога аддзела ўнутраных спраў, экспертыза паказала, што гэта косныя парэшткі пяці чалавек, і датуюцца яны менавіта тым перыядам, якім датуюцца пахаванні ў Курапатах, — 1937–1941 гадамі».

Па словах Антона Астаповіча, які праходзіць па справе ў якасці сведкі, зараз гэту крымінальную справу вядзе Мінскае абласное ўпраўленне ўнутраных спраў, але інфармацыі пра ход расследавання вельмі мала. Што да таго, ці знойдуць злачынцаў, якія здзейснілі красавіцкі акт вандалізму ў Курапатах, то тут старшыня Таварыства аховы помнікаў не цешыцца ілюзіямі.

«У звязку з тым, што колькі ўжо было крымінальных спраў, у мяне слабы спадзеў на тое, што злачынцы будуць знойдзены, — адзначае Антон Астаповіч. — Па вялікім рахунку, па тых уліках — а гэта пэўныя апалкі, сляды — цяжка шукаць зламыснікаў у двухмільённым горадзе, а можа ўвогуле ў дзесяцімільённай Беларусі».

Што да стаўлення дзяржавы да «народнага мемарыяла» ў Курапатах, то, па словах Антона Астаповіча, ахова тут толькі перыядычная з заездамі аўтапатрулёў; у чарговы раз адмоўлена ў прыцягненні да пешага патрулявання вайскоўцаў міліцэйскай брыгады 3310, якая базуецца ў ваколіцы. «Так што ўсё застаецца на старым узроўні, і ўвогуле, перспектыў па ўсіх справах у Курапатах пакуль не бачна», — лічыць грамадскі актывіст.

Антон Астаповіч заклікаў людзей, якім неабыякавы лёс Курапатаў, дапамагчы зрабіць поўную навуковую інвентарызацыю гэтага ўрочышча з усімі элементамі «народнага мемарыяла», каб дабіцца ад уладаў афіцыйнага статуса не толькі гэтага места як урочышча, але ж і самога стварэнага людзьмі мемарыяла.

Антон Астаповіч падкрэсліў, што гэтым разам Міністэрства культуры Беларусі спрацавала вельмі хутка і без зацягванняў і залішняй бюракратыі выдала дазвол на перазахаванне парэшткаў ахвяраў сталінскіх рэпрэсій у тым месцы, дзе быў здзейснены акт вандалізму...

Каля так званай Курапацкай Галгофы святар аўтакефальнай праваслаўнай царквы Леанід Акаловіч правёў жалобнае набажэнства, пасля чаго чорную скрыню з парэшткамі бязвінна забітых апусцілі ў магілу, да якой прысутныя ўсклалі кветкі і паставілі запаленыя знічкі і лампадкі.

Але перад гэтым адбыўся не вельмі прыемны інцыдэнт: на месцы падзеяў з'явіўся мінёр у званні падпалкоўніка міліцыі, які з дапамогай спецыяльнага прыстасавання даследаваў скрыню з парэшткамі на прадмет наяўнасці ў ёй выбуховых рэчываў. За ўсім, што адбывалася ў гэты вечар у Курапатах, у прынцыпе, як і заўжды, калі там нешта ладзіць грамадскасць, пільна сачылі супрацоўнікі міліцыі, а таксама невядомыя ў цывільным. Дарэчы, гэтым разам ніхто з іх не пасмеў адабраць у прысутных бел-чырвона-белы сцяг.

▸ **АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ**

# У ПОШУКАХ АЎТАРА ПЕРАМОЖНАГА СЦЭНАРУ

Сяргей НІКАЛЮК

**Мяркую, чытачам «НЧ» знаёмы дзіцячы вершык пра котку, якой пашчасціла патрапіць у палацы англійскай каралевы. Гэты шэдэўр народнай паэзіі я рэгулярна ўзгадваю, калі чытаю палітычную публіцыстыку, бо кожны аналітык, быццам персанаж вершыка, глядзіць на свет праз прызму ўласнага жыццёвага досведу і сваіх ведаў (аўтар гэтых радкоў таксама не выключэнне). У выніку кожны заўважае толькі сваю «мышку» на беларускім палітычным дыване.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна



## У кожнага свае «мышы»

Возьмем, да прыкладу, артыкул Валерыя Карбалевіча «Паражэнчы сіндром апазіцыі», апублікаваны нядаўна ў газеце «*Свободные новости плюс*». З кожным яго абзацам я асабіста магу пагадзіцца. На першы погляд, бясспрэчнай падаецца і заключная выснова аўтарытэтнага ў Беларусі палітолага: «Пераможны сцэнар магчымы толькі пры ўмове, калі большасць апазіцыі аб'яднаецца вакол адзінага кандыдата, які павінен з'явіцца за некалькі месяцаў да выбараў. Збор подпісаў за двух, трох і больш прэтэндэнтаў — гэта безумоўны шлях да паразы».

Не, я не супраць «адзінага кандыдата». Супольна і бацьку лягчэй біць. Ісціна гэта вядомая не толькі палітолагам. Дык у чым жа тады пытанне? Калі сур'ёзна, то пытанне ў мадэлі. У тэарэтычнай мадэлі, на якую абапіраецца — свядома або неўсвядомлена — Валерый Карбалевіч, калі аналізуе бягучыя падзеі. Дарэчы, і сам адбор падзей для наступнага аналізу не ў апошнюю чаргу абумоўліваецца абранай мадэллю.

У дадзеным выпадку выкарыстоўваецца класічная заходняя мадэль, паводле якой палітычны працэс зводзіцца да супрацьстаяння ўлады і апазіцыі. Канал «Еўраньюс» практычна штодня дае нам магчымасць назіраць за падобным супрацьстаяннем, што адбываецца ў краінах, якія знаходзяцца заходней «геаграфічнага цэнтра Еўропы». Таму няма нічога дзіўнага ў тым, што на нашых абшарах узнікае не толькі патрэба, але і здольнасць аналізаваць айчынныя падзеі ў рамках імпартнай мадэлі.

Наколькі такое запазычанне прадуктыўна? Практыка — крытэр ісціны, а таму прапаную асэнсаваць памятныя яшчэ шмат каму падзеі гарбачоўскай перабудовы ў тэрмінах супрацьстаяння ўлады і апазіцыі. Такім чынам, з аднаго боку мы маем уладу ў асобе партыйна-гаспадарчай наменклатуры. У яе руках засяроджаныя практычна ўсе матэрыяльныя рэсурсы краіны, якія яна шчодра выдаткоўвае на захаванне ўласнай бяспекі. А што мы маем з іншага боку? Групу дысідэнтаў, раскіданую да пачатку перабудовы па месцах «не такіх аддаленых». Прызнаюся, асэнсаваць падзеі, якія адбыліся амаль дваццаць гадоў таму, у пазначаных вышэй тэрмінах асабіста я не ў стане, ды і пра чыесьці ўдалыя спробы такога асэнсавання мне не вядома.

Аднак адмаўляць факт перабудовы бессэнсоўна. Літаральна за некалькі гадоў маналіт улады рассыпаўся, і гэта быў не першы маналіт, лёс якога апынулася настолькі сумным. У лютым 1917 года гісторыя развівалася па аналагічным сцэнары. Улада Раманавых, якія адзначылі за некалькі гадоў да згаданых падзей трохсотгоддзе свайго знаходжання на расійскім троне, нечакана апынулася «ў брудзе».

## Беларускія арцяковы

Расійская ўлада патрабуе ад беларускага ўраду перадаць дзяржаўныя прадпрыемствы расійскім карпарацыям. Гэта лепшая гарантыя таго, што Беларусь і ў выпадку сыходу Лукашэнкі, які, як вядома, шмат каго раздражняе ў расійскім кіраўніцтве, застанецца пад кантролем Крамля. Ахова расійскіх межаў і ўдзел у сумесных абаронных праектах, якімі так ганарыцца Лукашэнка (па яго словах, гэта проста не мае цаны), з пункту гледжання расійскай улады, якая больш баіцца рэальнай ваеннай канфрантацыі з Захадам, каштуе мала.

**Kasparov.ru (Расія)**

Папросту жах, што робіцца на белым свеце — зусім ад крызісу ў людзей нервы здаюць. Пачынаюць ужо на сваіх блізкіх кідацца. Асабліва калі тыя грошы па першым патрабаванні не даюць. Вось мы Беларусі хацелі выдаць шматмільярдны крэдыт, ды падумалі і вырашылі пачакаць. Аднак, пачуўшы такое, Бацька вельмі пакрыўдзіўся і параіў расійскаму міністру фінансаў Кудрыну прайсці курс лячэння, а не праяўляць салідарнасць з беларускімі адмарозкамі, якія на Бацьку гоняць за заходнія брудныя грошы. Тут ёсць адзін элегантны намёк: адмовіць Мінску ў сродках здольны толькі не цалкам здаровы чалавек.

**«Русский репортер» (Расія)**

Кіраўнік МЗС Грузіі Грыгол Вашадзе задаволены пазіцыяй Беларусі. «Грузінскі бок задаволена абдуманай і асэнсаванай пазіцыяй Беларусі», — заявіў Вашадзе на брыфінгу ў МЗС Грузіі. Нагадаем, што згодна з заявай прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Мінск будзе самастойна вырашаць пытанне прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. І не мае намеру прадаваць сваю пазіцыю. Лукашэнка таксама прызнаў, што ўмовай выдачы расійскага крэдыту ў памеры 500 мільёнаў долараў было прызнанне сепаратысцкіх анклаваў Грузіі.

**Georgia online (Грузія)**

Лукашэнка — як Кім Чэн Ір і лідэры іншых дзяржаў, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы, шукаюць грошы і палітычнае прызнанне, — можа далёка пайсці. Але такая гульня бесперспектыўная. Хутчэй за ўсё, ён хутка перадумае і будзе прасіць прабачэнні, што ўжо рабіў не раз.

**«Коммерсант» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ



### УКРАІНА. ПАЛТАЎСКАЯ БІТВА. ЧАСТКА ДРУГАЯ

700 супрацоўнікаў украінскага МУС будуць ахоўваць парадак падчас святкавання 300-й гадавіны Палтаўскай бітвы, якое прызначана на 26 чэрвеня. Прычына простая: тая бітва 1709 года мае вялікае сімвалічнае значэнне для рускіх і ўкраінскіх нацыяналістаў. Першыя трактуюць як эпахальную падзею, якая вывела Расію ў шэраг вялікіх еўрапейскіх дзяржаў. Другія ад яе вынікаў не ў такім вялікім захапленні. На думку шматлікіх украінцаў, перамога рускіх над шведамі пахавала праект гетмана Івана Мазепы, які напярэдадні бітвы перайшоў на бок шведскага караля Карла. Скандынаўскі манарх у якасці адплаты абяцаў для Украіны статус незалежнай дзяржавы. Гіпербалізацыя вынікаў Палтаўскай бітвы ў вачах нацыянальных радыкалаў гарантуе, што тыя абавязкова наведаюць Палтаву ў рамках святкавання юбілею і паспрабуюць з дапамогай фізічных сродкаў давесці сваю рацыю. Прадстаўнік МУС Украіны ўжо паведаміў, што, паводле аператыўных дадзеных, у Палтаву збіраюцца прыехаць правыя экстрэмісты з Масквы і Кіева.

**По матэрыялах «Українська Правда» (Украіна)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. «1984» – САМАЯ АКТУАЛЬНАЯ КНІГА СУЧАСНАСЦІ




Грамадскасць Брытаніі арыгінальна святкуе 60-ю гадавіну выхаду ў свет славутай кнігі Джорджа Оруэла «1984». «1984» — гэта адзін з самых славутых твораў, які папярэджвае пра пагрозу таталітарызму. Як вядома, адным з элементаў таталітарнага дзяржаўнага ладу, апісанага ў рамане, ёсць плакаты, якія можна пабачыць на кожным кроку. На іх выяўлены дыктатар Вялікі брат, які кажа: «Яназіраю за табой». Гэты лозунг, на думку шматлікіх грамадзянскіх актывістаў, вельмі нагадвае практыку відэаназірання. На цяперашні момант брытанскія ўлады лічаць, што эфектыўным сродкам барацьбы са злачынствамі можа быць сістэма відэанагляду за публічнымі месцамі. На думку іх апанентаў, гэта не што іншае як паўзучая дыктатура. Юбілей «1984» аказаўся вельмі своечасовым. Дадатковым аргументам у гэтай палеміцы сталі нечаканыя прызнанні Дэвіда Пепера, былога функцыянера паліцыі, які выступаў за тое, каб паліцыя запісвала тэлефонныя перамовы і нават інтэрнэтперапіску ў мэтах барацьбы з тэрарызмам. Напярэдадні юбілею кнігі Оруэла, Пепер на людзях прызнаўся: «Як паказалі выбухі ў Лондане 2005 года, відэакамеры назірання кепска дапамаглі ў барацьбе з фанатамі Аль-Каіды».

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### КУБА. ПРАВЫ ГЕЯЎ ЯК ЛАКМУСАВАЯ ПАПЕРКА ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ




У Гаване адбыўся марш за правы геяў і лесбіянак, які даў падставу для шматлікіх спекуляцый. Па-першае, у гэтым дэфіле ў першых шэрагах калоны маршыравала Марыэла Кастра, дачка Рауля Кастра, цяперашняга кіраўніка краіны. Яна, дарэчы, кіруе Нацыянальным цэнтрам сексуальнай адукацыі і, больш таго, крытыкуе ўрад, які з 1998 года забараніў праводзіць аперацыі па змене полу. І хоць права змяняць пол фармальна засталося, аднак ніводны з 28 чалавек, якія падаў з таго часу заяву ў адпаведныя структуры Міздраву (па закону аперацыя аплачваецца дзяржавай) не прайшоў усе інстанцыі, якія патрэбныя для згоды камісіі на аперацыю. Ёсць версія, што сваю ролю тут адыграе каталіцкая царква, якая падчас візіту на Кубу папярэдняга Папы заключыла своеасаблівы пакт з Гаванай: Куба прытрымліваецца дактрынаў Ватыкану ў галіне сямейнай палітыкі і ў пытаннях сексуальнай маралі, а Касцёл не крытыкуе Кубу за парушэнні правоў чалавека. Хаця гэта толькі плёткі. З іншага боку, міліцыя не атакавала несанкцыянаваны марш гомасексуалістаў і лесбіянак, што, на думку шматлікіх назіральнікаў, кажа пра цікавыя перспектывы цяперашніх рэформаў, якія праводзіць бацька Марыэлы.

**Па матэрыялах «El Pais» (Іспанія)**

▶ ВЫБАРЫ

# ГЛЯДЗІЦЕ, ХТО ІДЗЕ!

Алег НОВІКАЎ

**Выбары ў Еўрапарламент, якія прайшлі 5–8 чэрвеня, змянілі канфігурацыю палітычных сіл у ЕС. Самая галоўная тэндэнцыя — закат сацыял-дэмакратыі. Аднак святое месца пустым не бывае: левы фланг еўрапейскай палітыкі імкліва акупуюць новыя партыі.**




Каб зразумець глыбіню катастрофы сацыял-дэмакратаў, дастаткова прывесці адзіны факт: у Вялікабрытаніі, Францыі і Германіі партыі левага цэнтру атрымалі самую малую колькасць галасоў у пасляваенныя часы.

Аднак пра ўсё па чарзе: у Аўстрыі эсдэкі, якія ўваходзяць у вялікую кааліцыю з хрысціянскімі дэмакратамі, атрымалі 28 працэнтаў. У Германіі, дзе ружовыя таксама фармуюць блок з правымі цэнтрыстамі, — 20,8 працэнта. Як было сказана вышэй, гэта самы нізкі ўзровень падтрымкі эсдэкаў пасля другой сусветнай вайны. У Вялікабрытаніі лейбарысты ледзь не прапусцілі наперад экзатычных еўраскептыкаў з Партыі незалежнасці Аб'яднанага Каралеўства. У незалежнікаў 12 працэнтаў, у партыі Гордана Брауна — 15,8. У Францыі сітуацыя падобная. Партыя сацыялістаў мае ўсяго 16,8 працэнта. Менш партыя атрымлівала толькі ў 2002 годзе, калі на выбарах прэзідэнта праваляўся Ліанэль Жаспен. У Партугаліі, дзе 22 гады сацыялісты былі пры ўладзе, за іх прагаласавала 26 працэнтаў. У Польшчы Саюз левых дэмакратаў заняў ганаровае трэцяе месца, аднак ад пераможцаў — правых і лібералаў — яго аддзяляюць дзесяткі працэнтаў.

Не будзем ужо казаць пра краіны былога камуністычнага блоку, дзе палітычная культура вельмі прымітыўная і людзі часцей галасуюць за папулістаў, якія абяцаюць залатыя горы. Так, у Латвіі сацыял-дэмакраты (партыя, дарэчы, была створаная яшчэ ў XIX стагоддзі) атрымалі 3,8 працэнта.

Увогуле, толькі ў 13 з 27 краін ЕС сацыял-дэмакратам удалося сабраць больш за 20 працэнтаў.

Амаль іранічна выглядае той факт, што галоўны электаральны бастыён ружовых — Мальта. Тут за партыю прагаласавала больш за ўсё выбаршчыкаў у працэнтных суадносінах.

Рэзюме экспертаў: сацыял-дэмакратыя страціла ідэйную гегемонію ў грамадствах краін Заходняй Еўропы. Мова пра так званую канцэпцыю сацыяльнай дзяржавы.

Гісторык Йозеф Фантана на старонках блізкай да іспанскіх сацыялістаў газеты «*Publico*» піша, што галоўнай прычынай падзення эсдэкаў стала ідэйная эвалюцыя левацэнтрысцкіх партый у бок цэнтра. «Старыя партыі эсдэкаў ператварыліся ў партыі, падобныя да партыі дэмакратаў у ЗША. Яны занятыя праблемамі індывідуальных праў грамадзяніна, аднак не сацыяльных», — сцвярджае Фантана.

Гегемонія гегемоніяй, аднак праблемы сацыяльнай справядлівасці, доступу грамадзян да адукацыі і медыцыны, правоў працоўных калектываў, роўнасці жанчын (старыя галоўныя фішкі левых) дасюль застаюцца актуальнымі. Тым больш, калі на двары крызіс.

У нішу эсдэкаў імкліва накіраваліся новыя палітычныя фармацыі левай арыентацыі. Каго толькі тут няма! Новыя левыя партыі можна кваліфікаваць наступным чынам.

### Зялёныя

З пачатку 1980-х Зялёныя з'яўляюцца галоўнымі канкурэнтамі эсдэкаў у барацьбе за галасы левых выбаршчыкаў. Гэтыя выбары можна лічыць дастаткова паспяховымі: у 10 краінах ЕС яны перайшлі планку ў 8 працэнтаў. Больш таго, у Францыі, Фінляндыі, Галандыі, Латвіі і Люксембургу яны зраўняліся з сацыялістамі.

### Посткамуністы

Мова пра партыі, якія былі сфармаваныя на базе былых камуністычных прасавецкіх партый, аднак прынялі больш рэфармісцкія праграмы. Галоўнымі такімі партыямі ў ЕС з'яўляюцца шведская партыя Левыя, нямецкая партыя Левыя і Левы Фронт у Францыі (створаная да выбараў кааліцыя з камуністаў і часткі былых сяброў партыі сацыялістаў). Левыя і Левы Фронт набралі, адпаведна, 7 і 6 працэнтаў. Нямецкія Левыя трохі расчараваныя вынікамі (для іх было важна апярэдзіць Зялёных). А вось французскія чырвоныя могуць быць цалкам задаволенымі: яны не далі абагнаць сябе трацкістам.

### Камуністы

Да гэтага лагеру адносяцца партыі, якія прынцыпова адмовіліся карэктаваць свае дактрыны пасля падзення СССР, дасюль ідэалізуюць савецкі час. Як не дзіўна, за іх галасуюць. У Партугаліі камуністы атрымалі 10 працэнтаў, у Грэцыі — 8 працэнтаў.

### Посттрацкісты

Феномен посттрацкізму як масавага руху характэрны выключна для Францыі. Тут у мінулым годзе на базе адной з трацкісцкіх партый была створаная ідэйна больш шырокая Новая антыкапіталістычная партыя. За яе аддалі галасы 4,9 працэнта. Не шмат, аднак для пачатку, думаецца, неекпска.

### Левыя сацыялісты

Левыя сацыялісты — гэта яшчэ адзін цікавы від еўралевых. Шакаваныя тым, як СССР у 1956 годзе падавіў паўстанне ў Венгрыі, сябры шматлікіх кампартый Еўропы паклалі білеты на стол і пачалі будаваць сваю партыйную мадэль. Найбольш паспяхова атрымалася ў Нідэрландах і Даніі. Адпаведна, там сёння за левых сацыялістаў прагаласавала 7 і 16 працэнтаў электарату.

### Піраты

Самая экзатычная левая фармацыя ў ЕС, створаная на хвалі барацьбы маладых фанатаў кампутараў супраць буйных карпарацый кшталту *Microsoft*, што дамагаюцца ад урадаў забароны нелегальнага капіявання лічбавай прадукцыі (праграмы, музыка, кіно і г.д). Партыя піратаў была створана ўсяго тры гады таму, аднак здолела на выбарах у апошнія выходныя сабраць фантастычную колькасць галасоў — 7 працэнтаў.

Палітолагі лічаць, што спатрэбіцца яшчэ адзін электаральны цыкл, каб канчаткова зразумець — зможа або не альтэрнатыўная левая замяніць сацыял-дэмакратаў. Зараз, калі параўнаць колькасць галасоў, пададзеных за новых левых і эсдэкаў па ўсіх краінах ЕС, атрымліваецца, што маладыя левыя амаль наступаюць на пяткі мастадонтам.

Хаця ў прынцыпе не трэба здымаць пытанне, наколькі наогул левая ідэя запатрабаваная ў Еўропе ва ўсіх яе трактоўках і інтэрпрэтацыях. Напрыклад, у Францыі з яе моцнымі левымі традыцыямі, калі падсумаваць усе галасы, пададзеныя за левыя партыі (сацыялісты, Зялёныя, антыкапіталісты і Левы фронт), атрымліваецца, што за левых прагаласавала вельмі мала, усяго 27 працэнтаў выбаршчыкаў.

ЦІКАВА

# КАРОЛЬ ФІЛЬМАЎ КАТЭГОРЫІ «Б»

Алег ПЯТРОЎ

**У Бангкоку пры загадкавых абставінах памёр рэжысёр Дэвід Карадзін, якога лічылі каралём фільмаў катэгорыі «Б».**

Што такое фільмы катэгорыі «Б», лепш за ўсё кажуць іх назвы: «Смяротныя гонкі», «Абсалютнае зло», «Вар'ят на матацыкле», «Тэрор у горадзе» і г.д.

Такім чынам, фільмы катэгорыі Б — гэта малабюджэтныя не вельмі якасныя фільмы. Але гэтым па жанру гэта не альтэрнатыўная або парнаграфічная стужка. Хутчэй ключавым жанрам тут застаецца вестэрн, навуковая фантастыка, усходнія адзінаборствы. Сюжэт таксама не складаны: ёсць галоўны станоўчы герой, які ўступае ў змаганне з адмоўным і, натуральна, перамагае яго. Прымітыўнасць фабулы кампенсуецца эфектамі, кшталту такога, як падчас бойкі станоўчы персанаж забівае негатыўнага не проста так, а з дапамогай, скажам, бензапілы або нейкага ўсходняга кінжалу.

Як жанр малабюджэтнае кіно з'явілася дзякуючы прыходу гука напрыканцы 1920-х. Пасля гэтага кошты на кінавытворчасць выраслі ў некалькі разоў. Малыя кампаніі, каб застацца на рынку, вымушаны былі здымаць больш прымітыўныя карціны, якія, як не дзіўна, ахвотна куплялі малыя кінатэатры, і нават вялікія, каб у рэпертуары быў баланс.

У 1960–70-я гады, калі пад уплывам моладзевай рэвалюцыі публіка пачала патрабаваць ад Галівуда простых фільмаў пра жыццё людзей, фільмы катэгорыі «Б» сталі своеасаблівай лабараторыяй новага сацыяльнага амерыканскага кіно. Шматлікія стужкі гэтага часу, якія здымаліся за невялікія сродкі, увайшлі ў залаты фонд амерыканскага кінамастацтва (напрыклад, «Паўночны каўбой»). Аднак мэйнстрымам у гэтай катэгорыі ўсё роўна засталіся стужкі, разлічаныя на падлеткаў, якія не патрабуюць акторскай гульні і драматызму сюжэту, баевікі і фільмы жахаў.

Хаця фільмы катэгорыі «Б «не карыстаюцца асаблівай цікавасцю кінакрытыкаў, іх роля ў амерыканскай кінаіндустрыі вельмі важная. Па-сутнасці, гэта стартавая пляцоўка для маладых вытворцаў і акцёраў. Фільмы далі пропуск у вялікае кіно такім славутым зоркам, як Джон Вейн, Джэк Нікалсан. Малады Паланскі зрабіў сабе імя ў Галівудзе,калі зняў за невялікія грошы «Дзіця Размары». Некаторыя стужкі мелі такі вялікі поспех, што пазней былі перазнятыя буйнымі студыямі (напрыклад, «Ноч жывых нябожчыкаў»).

Каб канчаткова зразумець, пра што ідзе гаворка, трэба згадаць фільмы Квенціна Таранціна «Kill Bill». Калі памятаеце, фільм уяўляе сабою папросту своеасаблівую нарэзку пастановачных боек. Па-сутнасці, фільм Таранціна — гэта пародыя на фільмы катэгорыі «Б». Менавіта на фільмах гэтага жанру, дарэчы, сфармаваліся густы самога Таранціна. Ён нават ганарыцца тым, што ў дзяцінстве глядзеў выключна кінематаграфічную прадукцыю другога гатунку. Праўда, ён не ўдакладняе, што ўжо ў сярэдзіне 1970-х склалася асобая субкультура аматараў такога віду кінамастацтва. Сярод моладзі лічылася шыкам глядзець не папсу, а вось такі прымітыў.

У пачатковых цітрах фільму «Kill Bill» гаворыцца, што фільм прысвечаны аднаму з карыфеяў жанру кіно катэгорыі «Б» — Дэвіду Карадзіну

Дэвід Карадзін таксама зрабіў сабе кар'еру ў 1970-я. Ён запусціў серыял «Кунг-фу», дзе выканаў галоўную ролю маладога манаха з Шаоліня, які ў сярэдзіне пазамінула стагоддзя разам з настаўнікам блукаў па прэрыях Дзікага Захаду, поўных каварнымі індзейцамі і крыважэрнымі бандытамі. Усёй гэтай кампаніі наш манах добра дае прыкурыць.

Цікава, што на гэтую ролю спачатку хацелі ўзяць Бруса Лі, якога лічаць галоўным папулярызатарам моды на ўсходнія адзінаборствы. Брус быў фанатам кунг-фу. Ён нават біў сам сябе электрычным токам, каб развіць незвычайныя магчымасці цела. Аднак Карадзін дабіўся, каб ролю манаха выконваў ён.

Здымаць такія шэдэўры, як вы зразумелі, не цяжка. Не дзіўна, што за сваю кар'еру Дэвід (нарадзіўся ў 1936 годзе) зняў аж 200 фільмаў. Пры гэтым ён упарта не жадаў здымаць стужкі з вялікім бюджэтам, хаця лічыўся першакласным рэжысёрам. Дастаткова згадаць, што ён працаваў з такімі майстрамі, як Марцін Скарсэзэ і Інгмар Бергман.

Апошні свой фільм пад назвай «Эласцік» рэжысёр здымаў у Бангкоку. 4 чэрвеня пакаёўка знайшла яго мёртвым у сваім нумары. Прычыны смерці дасюль не зразумелыя. Карціна смерці выглядае як эпізод з ягоных фільмаў. Карадзін быў павешаны ў прыбіральні. Прычым вяроўкай была абмотаная не толькі шыя, але і геніталіі. Рукі ў рэжысёра былі звязаныя за спіной (прэса піша, што над галавою). Такая дзіўная поза нябожчыка выклікала шмат спекуляцый.

5 чэрвеня сямейны адвакат Карадзіна катэгарычна адмовіў версію самазабойства. Па ягоных словах, Дэвід быў забіты сябрамі секты кунг-фу. Прычынай маглі стаць апошнія перадсмяротныя заявы Карадзіна пра тое, што некаторыя аматары байцоўскіх мастацтваў звязаныя з крымінальнымі групамі.

Застаецца дадаць, што смерць рэжысёра прыйшлася на канец эпохі фільмаў катэгорыі «Б». Цяпершні сярэдні бюджэт аднаго фільму ў Галівудзе складае як мінімум 25 мільёнаў долараў. Укладваць такія шалёныя грошы без гарантый на іх вяртанне студыі баяцца. Таму часцей інвестуюць у здымкі карцін са славутымі акцёрамі або вядомым рэжысёрам. Тут усё больш прадказальна.



## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### МІРЭК ТАПАЛАНЕК

Былы прэм'ер-міністр Чэхіі ад правай кансерватыўнай партыі заявіў, што стаў ахвярай «змовы сацыялістаў». Змова палягае ў тым, што іспанская, блізкая да левых колаў, газета «*El Pais*» змясціла фота папарацы, якія той тайна зрабіў на Villa Certosa — прыватнай віле Сільвія Берлусконі ў Сардзініі. Цяпер усе толькі і гавораць пра інтымныя сувязі Сільвіа і 18-гадовай мадэлі Наомі, якія быццам сустракаліся менавіта на *Villa Certosa*. Аднак не толькі Наомі адпачывала там. Сюды прыязджалі адпачываць іншыя госці, якія, калі верыць здымкам, бавілі час у кампаніях з вельмі сімпатычнымі жанчынамі. Сярод тых фота ёсць здымак аголенага мужчыны. Хаця рэдакцыя «*El Pais*» зафарбавала твар таго перца (як і іншых людзей на фотаздымках), чэшская прэса чамусьці ўпарта лічыць, што заклапочаны мужчына на здымку менавіта Мірэк. Падставай для такіх высноў стала наяўнасць у мужчыны на фотаздымку белай павязкі на руцэ. Такую ж носіць Тапаланек (па яго словах, на знак салідарнасці з барацьбітамі за незалежнасць Тыбету). Сам Тапаланек заявіў, што на здымку дакладна не ён, і звязаў з'яўленне здымкаў з выбарамі ў Еўрапарламент. Калі яму верыць, сацыялісты з «El Pais» наўмысна зрабілі правакацыйны калаж, каб падарваць пазіцыі правых.



### РАХАТ АЛІЕЎ

Як ужо пісаў «НЧ», чарговай хваляй барацьбы Рахата Аліева з Астаной стаў выхад кнігі пад назвай «Хросны цесць». Фаліянт меў каласальны поспех. У краіне нават забаранілі папулярны інтэрнэтрэсурс Life Journal (Жывы часопіс), праз які распаўсюджваўся «Хросны цесць». Аднак, здаецца, улады краіны арганізавалі варты адпор на атаку з Вены. Праз некалькі дзён Аліеў абвясціў, што дасць прэс-канферэнцыю на казахскай службе «Радыё Свабода». Кожны, хто хацеў, мог задаць вялікаму змагару супраць тыраніі Назарбаева пытанне. У выніку спіс пытанняў канчаткова пазбавіў Рахата іміджу дэмакрата. Народ цікавілі не палітычныя схільнасці Аліева, а зусім іншыя рэчы. У рамках прэс-канферэнцыі фігуравалі такія вясёлыя пытанні, як, напрыклад, ці прысягаў на вернасць брытанскай кароне ягоны сын Айсултан — курсант англійскай вайсковай акадэміі? Чаму Аліеў-афіцэр у сваёй кнізе здаў усю рэзідэнтуру казахскай разведкі ў Еўропе? Што здарылася з яго былой чарнаскурай каханкай? Аднак самае экзатычнае пытанне гучала наступным чынам: «Рахат Мухтаравіч, нашто Вы, калі ўзначальвалі казахскі футбол, перавялі нашу федэрацыю з азіяцкай лігі ў склад УЕФА? Цяпер у нас няма ніякіх вынікаў. Мы прайграем усе матчы. Можа, было б лепш змагацца з узбекамі або японцамі? Зноў мы сталі ахвярамі вашых амбіцый».



### ДАНІЭЛЬ КОН-БЕНДЗІТ

Былы анархіст, лідэр студэнцкай рэвалюцыі 1968 года, празваны за свае рудыя валасы Чырвоны Дані, перажывае другое палітычнае нараджэнне. Ягоны блок «*Europe Ecologie*», створаны на базе французскай Партыі зялёных, нечакана атрымаў 16 працэнтаў на выбарах у Еўрапарламент. Для параўнання, галоўная партыя апазіцыі — сацыялісты — маюць толькі 20 працэнтаў. Цікава, што Кон-Бендзіт — грамадзянін Германіі, а не Францыі. У 1968-м яго нават дэпартавалі з Францыі як «непажаданага іншаземца». У адказ Даніэль пафарбаваў валасы і нелегальна вярнуўся ў захоплены студэнтамі Парыж. З тых часоў ён эксплуатуе сваю падвоеную ідэнтычнасць. Абіраецца ў парламент ЕС то ад Германіі, то ад Францыі (законы ЕС гэта дазваляюць). Трэба прызнаць, што як немцы, так і французы Чырвонага Дані сапраўды любяць і ахвотна за яго галасуюць. Аднак Дані гэтага мала. Ён выступіў з прапановай стварэння на базе груповак сацыялістаў і Зялёных у Еўрапарламенце парламенцкай большасці. Галоўная мэта — не дапусціць, каб Жазэ Барозу зноў стаў старшынёй Еўрапейскай камісіі. Зялёныя лічаць, што ён адказны за трафік праз аэрапорты ЕС сакрэтных вязняў ЦРУ. Праўда, нават калі экологі і сацыялісты аб'ядноўцца, гэтага будзе занадта мала. У новым парламенце будзе засядаць 151 сацыяліст і 51 дэпутат ад Зялёных. Між тым, фракцыя кансерватараў складаецца з 267 дэпутатаў.

▸ СПАДЧЫНА

# АДЛЕГЛАСЦЬ АД СЕНЫ ДА СВІСЛАЧЫ

Аляксей ХАДЫКА

**Два тыдні ўжо мінула з часу візіту прадстаўнікоў сям'і Радзівілаў на чале з 91-гадовай Альжбетай Радзівіл, якая апошняя сярод сямейнікаў добра памятае перадваенны стан самага вядомага ў Беларусі замка ў Нясвіжы і яго аздабленне, а «працяг тэмы» ў розных формах гучыць у СМІ.**


Photo.ByMedia.Net

Прадстаўнікі роду Радзівілаў у Нясвіжскім замку 27 мая 2009 года



Лошыца сёння

7 чэрвеня «Контуры» на АНТ прапанавалі «франка-беларускі» сюжэт пра лёс велікасвецкіх рэзідэнцый у розных краях Еўропы. Прайшла «нарэзка» пра замкі на Луары: інфармацыя пра магчымасць набыць закінутыя старадаўнія муры ва ўласнасць — за кошты ад некалькіх еўра да добрых мільёнаў, у залежнасці ад стану захаванасці і неабходных выдаткаў на ўтрыманне. Карыстанне — пры ўмове рэгулярных навуковых рэстаўрацый (захаванні аўтэнтычнасці аб'екта), калі нават кавалак старой тынкоўкі вяртаецца на сваё месца. Пры гэтым, паводле французскага заканадаўства, тры чвэрці рэстаўрацыйных коштаў кампенсуецца дзяржавай. Праўда, багацейшыя ўладальнікі не заўсёды яе патрабуюць. Абавязковая ўмова пражывання ў рэзідэнцыях — допуск наведвальнікаў па спецыяльным графіку. Зрэшты, гэта карысна і для папаўнення рэстаўрацыйнага бюджэту. Вандраванне візіцёраў па хвалях гістарычных летуценняў і ўспамінаў спалучаецца з ненавязлівай прагматыкай вырашэння штодзённых задач падтрымання жыцця фантастычна прыгожых будынкаў.

Другі фокус перадачы: Беларусь. Вось Любча блізь Навагрудка — некалькі год кансервацыю рэштак замка, калісьці маёмасці Кішак, пазней Радзівілаў, вядзе спецыяльна ўтвораны грамадскі фонд «Любчанскі замак» на чале з выхадцам з гэтых мясцін Іванам Пячынскім — на грамадскіх пачатках. Падобная спроба аднаўлення Быхаўскага замка Сапегаў сіламі прыватнага інвестара пакуль спынена з-за недахопу сродкаў, хаця праект рэгенерацыі распрацоўваўся з прыцягненнем спецыялістаў, прапаноўваўся ўвазе грамадства і выглядае зробленым прафесійна.

На экране мільгае намеснік старшыні Камітэта па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Міністэрстве культуры Ігар Чарняўскі — гутарка закранае пытанні інвестыцый у аднаўленне старадаўніх помнікаў і аўтэнтычнасці іх адраджэння. Праўда, эфектыўнасць дзейнасці камітэта выклікае вялікія сумненні ў справе збераження вялікай колькасці аб'ектаў: у апошнія гады шматлікія скандалы з нагоды адбудовы парэшткаў гістарычных кварталаў сталіцы, пры рэканструкцыі цэнтра Гродна, і асабліва — у Нясвіжы.

У адрозненне ад краін на захад ад Беларусі, у нас дзяржава — уласнік былых прыватных рэзідэнцый — не жадае нават весці гутарку пра вяртанне іх былым уласнікам. Вельмі паказальны эпізод: у папярэдні прыезд у Беларусь, у 1993 годзе, той жа княгіні Альжбеце Радзівіл з падачы прафесара Адама Мальдзіса дзве супрацоўніцы Нацыянальнага архіва прапанавалі ідэнтыфікаваць і падпісаць фотаздымкі з сямейнага архіву. Адзін з іх аказаўся унікальным, адсутным у самой княгіні: на ім яна яшчэ дзяўчынкай паказана побач з бацькам на балконе замка ў Нясвіжы. Адзін з сотняў прынесеных — але калі Альжбета Радзівіл папрасіла перадаць яго ёй, то пачула ў адказ: здымак — уласнасць беларускай дзяржавы, немагчыма!

Калі ж за справу ратавання палацаў або замкаў у нашай краіне бярэцца прыватнік, дзяржаўныя арганізацыі забываюцца пра такі істотны для практыкі захавання аб'ектаў мінулага падыход, практыкаваны ў іншых краінах: дапамагаць гаспадару. Бо архітэктурны помнік — частка агульнай нацыянальнай культурнай спадчыны. Затое, беручыся за рэстаўрацыю самастойна, беларуская дзяржава надта ўжо часта пераўтварае аўтэнтычныя будынкі ў мёртвыя муляжы. Ці дарма першыя словы, прамоўленыя княгіняй Альжбетай Радзівіл у Нясвіжскім замку: «Божа, руіна...»

Бліз сцен паўзнішчанага такой бандыцкай рэстаўрацыяй Нясвіжа 27 мая адбылася паказальная размова паміж княгіняй Альжбетай і кіраўніком рэстаўрацыі Сяргеем Друшчыцам. Звярнуўшы ўвагу на недарэчны цыбулепадобны кшталт вежы («ідыёцкая форма!») княгіня атрымала пыхлівы адказ, што рэстаўрацыя вядзецца па навуковых прынцыпах. Праўда, тут хіба памылачка выйшла... Што засталося адказаць хавальніцы традыцый сям'і — хіба тое, што, у адрозненне ад яе, пан беларускі рэстаўратар не жыў у замку, калі той заставаўся яшчэ арганічна цэласнай істотай, кожны кавалак якой, увасабляючы дух стагоддзяў, памятны Альжбеце.

Пасля 1939 года яшчэ багатыя, насуперак шматлікім рабаванням, калекцыі карцін, мэблі, побытавых рэчаў раз'ехаліся паміж Мінскам, Піцерам, Масквой і Варшавай, паміж музеямі і прыватнымі прайдзісветамі. Знішчаны інкруставаныя паркетныя падлогі. Але чаму ўжо зараз, пры рэстаўрацыі, гінуць кафлі печаў і камінаў і тая аўтэнтычная тынкоўка, нават маленькі кавалак якой вяртаюць на месца рэстаўратары Луарскіх замкаў у Францыі? У нас жа знікаюць квадратныя метры ляпных арнаментаў... Зірніце з здымак зруйнаванага і «адноўленага» будаўнікамі трохпавярховага корпуса-муляжа побач з цэнтральным аб'ёмам комплексу — мёртвыя гладкія сцены, пазбаўленыя натуральнай шурпатасці гістарычных муроў. А як вам металадахоўка на карпусах XVI–XVIII стагоддзяў?

Зразумела, чаму ў гэты прыезд, увайшоўшы ў радавое гняздо, былыя гаспадары паспяшаліся не ў «адноўленыя» пакоі надбрамнага корпуса, а ў яшчэ не дарэшты перароблены памяшканні. Альжбета — каб сустрэцца сам-насам з успамінамі. Бо гэта драматычны досвед нават для чалавека, якога не звязваюць з помнікам сямейныя сантыменты — сутыкацца з навадзелам замест сцен, дзе жыла гісторыя.

Тое ж самае Радзівілы ўбачылі і ў Мірскім замку: сучасная цэгла замест рэстаўрацыйнай, пластыкавыя дзверы і вокны замест сапраўдных драўляных, нарэшце, безгустоўны шэры плот, якім з невядомай мэтай абнеслі замак.

«Новы час» ужо звяртаўся да праблем, звязаных з рэстаўрацыяй самых вядомых архітэктурных помнікаў краіны. Праблем, якія могуць зрабіцца непераадольнымі, калі аўтэнтычнасць муроў будзе страчана канчаткова. Добра, што і АНТ, хоць і ў мяккай форме, звярнула на гэта ўвагу. Зазначыўшы: у Францыі — сотні замкаў, і прадуманая сістэма іх збераження і выкарыстання. У нас — паўтара дзесятка і толькі хаатычныя спробы вырашыць задачу іх захавання. Але, на жаль, гэта Эзопава мова гучыць там, дзе даўно наспеў час біць у званы або звяртацца да судовага разбору справы.

***P.S.*** Падрабязныя рэпартажы пра апошні радзівілаўскі візіт карэспандэнта Глеба Лабадзенкі, аднаго з арганізатараў візіту, глядзіце ў яго блогу: *http://labadzenka.by.* Раім звярнуць увагу на гэтым блогу на фотарэпартаж аўтара ад 8 чэрвеня *http://labadzenka.by/?p=3790* — такая ж «рэстаўрацыя»-руйнаванне Лошыцкай сядзібы ў Мінску фірмай «Эльвіра». Ад будынку амаль нічога не засталося...

Аўтар фота — Аляксей Кульбіцкі, Глеб Лабадзенка, Алекс Кнораз



Альжбета Радзівіл з бацькам на балконе Нясвіжскага замка 1930-я



Любча. Вежа замка

СВЯТА

# «НАРЭШЦЕ ЯНЫ САБРАЛІСЯ РАЗАМ»

## БЕЛАРУСКІ ПАВІЛЬЁН 53-Й ВЕНЕЦЫЯНСКАЙ БІЕНАЛЕ НА БЕРАЗЕ СВІСЛАЧЫ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Біенале ў Венецыі — гэта, без перабольшанняў, крута. Кожны няпарны год, пачынаючы з 1895-га, мастакі Еўропы (а цяпер і свету) збіраюцца ў горадзе святога Марка, каб прадэманстраваць свае апошнія дасягненні. На біенале ў Венецыі звяраюць тэндэнцыі, знаходзяць натхненне і абменьваюцца досведам вяршкі артыстычнага бамонду планеты. Вось і сёлета, з чэрвеня па лістапад, аматараў мастацтва чакаюць поўныя арту павільёны 77 краінаў, у тым ліку краінаў-дэбютантак фестывалю — Аб'яднаных арабскіх Эміратаў і Чарнагорыі.**




Афішы з анонсамі няісных фільмаў мастака-афармляльніка кінатэатру «Піянер» Аляксандра Бельскага




«Black Market» Аляксея Лунёва

Латышскія мастакі размясціліся ў самым цэнтры горада — паміж плошчай св. Марка і мостам Рыальта. Украінскія — у *palazzo Papadopoli* на Гранд-канале — пры ўваходзе наведнікаў вітае гіганцкая выява куратара ўкраінскага павільёну — баксёра Уладзіміра Клічко. Як ніколі маштабна прадстаўленая сёлета ў Венецыі Расія, якая яшчэ ў пачатку ХХ стагоддзя збудавала сабе павільён у сэрцы біенале — садзе Джардзіні: бюджэт толькі цэнтральнай расійскай выставы — «Перамога над будучыняй» — склаў каля 600 тысяч еўра, выдзеленых Мінкультам Расіі і камерцыйнымі структурамі. Пачаў працу і Беларускі павільён 53-й Венецыянскай біенале. Але паколькі арэндаваць *palazzo* ў Венецыі беларускім мастакам не ўдалося, было вырашана правесці свята мастацтва, не выязджаючы з Мінска, — у выставачным цэнтры БелЭКСПА на вуліцы Янкі Купалы, 27.

І ў гэтым было маё самае галоўнае расчараванне ад выставы сучаснага мастацтва, якая з 3 па 6 чэрвеня мела месца ў Мінску ў рамках 7 міжнароднай выставы-кірмаша «DesignФармат–2009. Рэклама. Фота. Арт». Бо я абсалютна шчыра паверыла: беларусы на біенале будуць, выстава ў Мінску — «разагрэў» перад галоўным дзействам, што разгорнецца ў Італіі. Насцярожыла хіба тое, што адкрыццё выставы прыпала акурат на дні адкрыцця біенале ў Венецыі — калі міжнародны бамонд, мастакі і прэса ўжо расхаджвалі на VIP-вернісажы па павільёнах сада Джардзіні, у Мінску толькі-толькі напаўнялі віном пластыкавыя кубачкі. Выявілася ж, што гэта «завочны», незалежны і — буду цынічнай — паралельны ўдзел беларускага мастацтва ў сусветным мерапрыемстве. «Гульня ў Венецыянскую біенале», як любіла паўтараць куратарка мінскай выставы Лізавета Міхальчук.

Калі ж абстрагавацца ад сусветнага кантэксту і агледзець «Беларускі павільён» як рэч у сабе — нагоду калектыўнай прэзентацыі актуальнага беларускага мастацтва, то выстава, на мой погляд, вельмі нават удалася. Антаніна Слабодчыкава дзеля сваёй інсталяцыі «*Black Job*» жорстка выкарыстала цэлы мех плюшавых зверанятаў. Канцэптуаліст Аляксей Лунёў раскрыў тэму чорнага ў серыі графічных прац *Black Market*. Былі прадстаўлены фотапрацы Андрэя Лянкевіча, мастацкія аб'екты інтэр'еру Максіма Осіпава (сярод іх пано «ордэн Элеаноры Язерскай»), саламяная інсталяцыя Артура Клінава, карціны галоўнага рухавіка праекту — Руслана Вашкевіча і іншых сучасных мастакоў, мелі месца дыскусіі пра актуальнае мастацтва, перформансы ды арт-прэзентацыі. Як і ў Венецыі, у Мінску вызначалі пераможцаў фестывалю.

Галасавалі простыя наведнікі і прафесійныя крытыкі мастацтва. У выніку найлепшым быў прызнаны 25-гадовы Сяргей Шатохін, які прадставіў калажы, на якіх спалучыў Мінск з еўрапейскай ды амерыканскай арт-прасторай гламурных ды канцэптуальных фотапрастораў, а таксама скрынку з гісторыяй мастацтва — у якой запоўніў больш за сотню ячэек рэчамі, кожная з якіх сімвалізавала самага значнага мастака свету таго ці іншага прамінулага года.

Апроч схільнасці да калажу, цытатнасці ды поп-арту, 30 мастакоў розных пакаленняў ды жанраў аб'ядноўвала няшмат. «Нарэшце яны сабраліся разам», — кпіў у кулуарах вядомы крытык, намякаючы на тое, што гэта ці не першы за доўгія гады маштабны супольны праект незалежных, нефармальных мастакоў і дызайнераў Беларусі.



Фота Керсціны Шульц

Арт-венікі з матывамі «мезальянсаў» Максіма Осіпава

«Мне здалося, мастакі вельмі баяліся, што іх не зразумеюць, — расказвае Алеся Серада, журналістка і культуролаг, дзяўчына з вялікім фотаапаратам, якая прадставілася як «група падтрымкі біенале» і зладзіла мне экскурсію па экспанатах. — У шэрагах мінскай арт-багемы існуе стойкі міф пра зашоранасць беларускай публікі: маўляў, нашы людзі гэтага не зразумеюць. Але практыка паказала, што наведнікі рэагавалі на ўсё, што пабачылі, вельмі пазітыўна — адразу ўключаліся ў гульню, прапанаваную мастакамі. Нават мужчынскія яечкі (у рамках інсталяцыі Канстанціна Гарэцкага яны пульсавалі на экране тэлевізара, пакладзенага ў скрынку, і мелі подпіс «Мужчынскае сэрца любіць Бацькаўшчыну — ЕВ), нікога асабліва не шакавалі. Гледачы асцярожна падкрадаліся да іх на бяспечную адлегласць, хуценька заглядалі ўнутр скрыні, дзе жылі яйцы, а потым адхіналіся і казалі «фу» або «прыкольна»... зусім як дзеці! Дарэчы, дзеці ўспрымалі эпатаж таксама абсалютна адэкватна. Я бачыла дзяўчынку, якая паглядзела на мульцяшную выяву Беласнежкі з чэлесамі замест вачэй і рашуча сказала: «Мама, мы не будзем глядзець на лялю. Ляля плача. Хадзем глядзець сініх балерын».

Па словах Алесі, у сустрэчы публікі з мастакамі і ўзаемапаразуменні праз неадназначныя аб'екты мастацтва і палягалі сутнасць і плён падзеі: «Для Беларусі гэта была сапраўды паказальная выстава. Каб жа не тая Венецыя...»

На маю думку, варта аддаць належнае смеласці арганізатараў выставы, якія, рызыкоўна падставіўшы ўдзельнікаў пад абвінавачванні другаснасці, закамплексаванасці ды правінцыйнасці, не пабаяліся заявіць пра асноўную праблему нефармальнай беларускай культуры — поўнае яе ігнараванне з боку дзяржавы. Ёсць падазрэнне: калі б тым самым мастакам сапраўды выпаў шанец узяць удзел у біенале ў Венецыі, маштабы творчых задумаў былі б большыя, а спосабы рэалізацыі — цікавейшыя. Бо трэба яшчэ паспрачацца, што лепей, эфектыўней і іміджавей прадстаўляе тую ці іншую дзяржаву на сусветным узроўні — хакей, пераможца конкурсу «міс краіны» ды поп-выканавец ці павільён актуальнага мастацтва ў Венецыі. Але тут згадваеш пра істэрыку, якая гарантавана распачынаецца на афіцыйным узроўні, калі Беларусь едзе куды-небудзь «паказаць сябе».

Беларускі павільён далучыла да Венецыянскай біенале не толькі наяўнасць непадалёк ад аб'ектаў мастацтва праточнай вады (у нашым выпадку — блізкая Свіслач). З нядаўняга часу біенале ў Венецыі — недзяржаўнае прадпрыемства, якое фінансуецца прыватнымі фондамі. Маштабы фінансавання розныя, але ў Мінску ішлося пра незалежнае, нефармальнае, неафіцыёзнае мастацтва, якое, як тая Беласнежка прынца, чакае свайго разумеючага мецэната.



Фота Керсціны Шульц

Гісторыя мастацтва ХХ стагоддзя Сяргея Шатохіна

ФЭСТ

# «НОЧ КУЛЬТУРЫ» Ў ЛЮБЛІНЕ

Любоў ПРАНЕВІЧ

**Звыш 260 імпрэзаў у 100 месцах адбыліся цягам адной ночы ў польскім горадзе Любліне. Living Рознафарматныя мерапрыемствы, аб'яднаныя назвай «Ноч культуры», былі накіраваныя на пошукі Чалавека, які неяк згубіўся сярод банкаў, паркінгаў, казіно, супермаркетаў і бігбордаў з рэкламай. Мастакі, акцёры, пластыкі, музыканты і акрабаты выйшлі на вуліцы горада, каб у новых нечаканых формах мастацтва знайсці і абудзіць Чалавека, адказаць на пытанне: «Чалавек створаны для горада, ці горад для чалавека?»**

Люблін — гэта горад з 350 тысячамі насельніцтва, двума вядомымі ва ўсім свеце універсітэтамі — Марыі Кюры-Складоўскай і Люблінскім каталіцкім універсітэтам, Старым горадам, які захаваўся ў добрым стане, і надзвычай высокім узроўнем культурнага жыцця. Культурныя мерапрыемствы ў Любліне з кожным годам набываюць усё новыя формы і маштабы, развіваюцца і гарманічна ўваходзяць у жыццё гараджан, становяцца традыцыйнымі. Міжнародныя кінафестывалі, тыдні тэатра, творчыя конкурсы, майстар-класы ў розных галінах культуры, музычныя канцэрты, спатканні з польскімі і замежнымі знакамітасцямі — горад, які пасля стрыманай Беларусі прадстаўляецца сапраўднай культурнай сталіцай.

Сёлета ўжо ў трэці раз у «Ноч культуры» з 6 на 7 чэрвеня, тысячы люблінцаў і гасцей польскага горада вандравалі па ўпрыгожаных вуліцах і задарма наведвалі адчыненыя з нагоды свята мастацкія галерэі, музеі, бібліятэкі, філармонію, тэатры і кінатэатры.

З бараў, кавярняў і рэстарацый ліюцца гукі джазу, з раскіданых па ўсіх вуліцах канцэртных пляцовак даносяцца харавыя спевы, якія перамяжоўваюцца з гітарнымі рыфамі цяжкага року. Парадаксальна, але і ў натоўпе людзей нельга застацца проста гледачом ці назіральнікам: вось побач з табой падае на калені на камяні Старога горада нядаўні, здавалася б, такі ж, як і ты мінак, ён нешта крычыць, прасціраe рукі, побач яшчэ некалькі чалавек пачынаюць іграць свае ролі, і разумееш, што знаходзішся ў цэнтры падзеі — хэпінінгу.

На кожнай вуліцы, нягледзячы на імжысты дожджык, з дапамогай мультымедыйнай праекцыі і інсталяцыі з'яўляюцца часткі чалавечага цела: рукі, ногі, галава — так люблінцы працягваюць шукаць Чалавека. На кожным кроку мастацтва заяўляе пра сябе. Перад галоўным уваходам Кароннага трыбуналу — будынку, дзе адбываюцца мерапрыемствы з удзелам высокапастаўленых асобаў, — у самым сэрцы горада стаіць некалькі дзесяткаў дзіцячых гаршчкоў. Малады чалавек запрашае ўсіх жадаючых туды «пасікаць». Ніводнага мінака гэты жарт не пакідае без усмешкі, а некаторыя далучаюцца да натоўпу, каб дачакацца, ці пагодзіцца хто-небудзь на такую прапанову.

Мастацтва чысцей за словы, яно перадае на ўзроўні эмпатыі частку праўды, якую адчувае мастак, дае сапраўдную свабоду. Нездарма арганізатары «Ночы культуры» абралі не словы, а мастацкія сродкі. На галоўнай вуліцы адбываюцца перформансы і шэсці. Сапраўдныя афрыканцы і размаляваныя пад афрыканцаў люблінцы частуюць усіх жадаючых вегетарыянскім пловам і гарачай кавай са збожжа. Такая ветлівасць у ветраную дажджлівую ноч асабліва прыемная. Але кусок у горла не лезе, калі звяртаеш увагу на плакаты, развешаныя побач з намётамі афрыканцаў: «Кожныя 3,6 хвіліны ў Афрыцы адзін чалавек памірае з голаду». Побач стаіць намёт маскіровачных колераў, абцягнуты сеткай. Перад ім па зямлі раскіданая вопратка, выпацканая ў чырвоную фарбу. Яна сімвалізуе забітых на вайне людзей. Гэта акцыя-напамін пра тое, што і зараз у розных кропках зямлі адбываюцца ваенныя дзеянні.

На адну ноч Люблін ператвараецца ў адно дынамічнае здарэнне. Хтосьці з вандроўнікаў параўнаў Люблін у «Ночы культуры» з карнавалам у Рыо-дэ-Жанейра.

Трапляеш у такі горад — і адчуваеш сябе сапраўдный асобай, гараджанінам, для якога створаны ўсе ўмовы для жыцця і адпачынку. Аўтаматычна шукаеш, а што ж такога ў нашай краіне можна прывесці ў прыклад падобнай смеласці мастацкага выражэння ў гарадскім фармаце. Рыцарскія фестывалі сярэднявечнай культуры, «Дударскі фэст»... Але яны адпадаюць, бо загнаныя ў рамкі адной тэматыкі. Перад вачамі свяктаванні дня горада, «Дажынкі», дзяржаўныя святы, але, на жаль, яны толькі выкананне загаду і нізкаякаснае сцвярджэнне дзяржаўнай ідэалогіі. Калі захочаш у беларускім горадзе вольна выказаць сваю творчую пазіцыю, адразу адчуеш, што чалавек створаны для аграгарадкоў і калгасаў, для заводаў і выплаты крэдытаў, для працы на хлеб і малако.

Цешыць, што ёсць гатоўнасць суседзяў падзяліцца сваім культурным досведам. Дарэчы, высокая якасць арганізацыі культурных імпрэзаў і адданасць традыцыям ставіць Люблін на ўзровень горада-кандыдата, годнага змагацца за тытул «Еўрапейская сталіца культуры» ў 2016 годзе.

ЦІКАВА

# КАНЕЦ СЛОВАЎ

## ПРА ПРАЕКТ

**«Вечны» каляндар «Канец словаў» — прэцэдэнт комплекснай прамоцыі беларускай літаратуры праз аранжыроўку актуальных тэкстаў гламурным візуальным шэрагам яз элементамі ню.**

«Канец словаў» можна разумець па-рознаму — як вычарпанасць творчага акту, перспектыву новага тэксту альбо невербальнае выказванне літаратара. Таму тут ёсць месца і аголеным азадкам, і тэкстам (у літарах і малюнках), і іх агульным кантэкстам — той прасторы, дзе ў галовах з'яўляюцца словы.

Фатографы арт-календару: Андрэй Шчукін і Дзяніс Нядзельскі.

12 месяцаў:
СТУДЗЕНЬ — Віктар Шалкевіч
ЛЮТЫ — Віталь Рыжкоў
САКАВІК — Юрась Барысевіч
КРАСАВІК — Севярын Квяткоўскі
ТРАВЕНЬ — Анатоль Івашчанка
ЧЭРВЕНЬ — Андрэй Такінданг
ЛІПЕНЬ — Андрэй Хадановіч
ЖНІВЕНЬ — Сяргей «Пістончык» Прылуцкі
ВЕРАСЕНЬ — Андрэй Адамовіч
КАСТРЫЧНІК — Усевалад Сцебурака
ЛІСТАПАД — Ілля Сін
СНЕЖАНЬ — Лявон Вольскі
А таксама Валянцін Акудовіч (на вокладцы)

**Удзельнікі пра праект:**

**Юрась Барысевіч:** «Я пагадзіўся на ўдзел таму, што вырашыў прынесці мужчынскае цела ў ахвяру жаночаму воку. Менавіта такі варыянт мне і прапанавалі, экстрэмальны — узімку голым паздымацца... Я не страшыўся мерзнуць. І нельга сказаць, што я быў ужо зусім голым. У мяне быў абутак — балея з цэментам. А з вопраткі ў мяне была рыдлёўка».

**Анатоль Івашчанка:** «Я не лічу гэта хуліганствам. Магчыма, калі б мы пазавалі зусім голымі ці калі б мы былі дзяўчатамі — гэта было б па-хуліганску».

**Севярын Квяткоўскі:** «Ідэя для нашага псеўдапурытанскага грамадства досыць хуліганская. А я люблю хуліганіць — інтэлектуальна, творча. І таму я з радасцю далучыўся. Я не эксгібіцыяніст. Але калі часам можна эпатаваць публіку, з задавальненнем гэта раблю».




**Сірошка Пістончык:** «У гэтым німа ні рэвалюцыі, ні правакацыі — эта проста жэст, своеабразнае запрашэнне да разгавора на балезненыя цемы. (...) У голава ліціратара наліцо дадатковае аружые у барбе з пурытанствам і ліцамерыем».

**Віталь Рыжкоў:** «Падчас фотасесіі я думаў пра тое, што гэты чалавек, з якога мяне малявалі, ад нечага памёр. І гэтыя чорныя кропачкі на лёгкіх, і гэтыя ненатуральных — відаць, мёртвых — колераў унутраныя органы... У мяне бодзі-арт з дыягназам. Толькі я не ведаю — з якім».

**Ілля Сін:** «Я адразу ўсведамляў, што гэта будзе не проста прыгожая выява, але — адлюстраванне маіх ідэяў. Тое, што можна пабачыць у календары, не столькі фотапартрэт, колькі своеасаблівая мастацкая акцыя, якая называецца «Апаганьванне іконы». Фота — тая форма, у якой гэта акцыя ўвасобілася».

**Андрэй Хадановіч:** «У Беларусі аднойчы мусіць распрануцца кожны. Калі літаратары — святарныя каровы, настаўнікі жыцця, жывыя помнікі самім сабе, аголеная задніца — адзіны жывы атрыбут, які ва ўсім гэтым ёсць. Нешта гарантавана «сваё».

**Прэс-канферэнцыя**

16 чэрвеня (аўторак) а 14.00 у кавярні «GRIP» (будынак к/т «Перамога», вул. Камсамольская, 19) адбудзецца прэс-канферэнцыя з нагоды выхаду арт-праекту.

Удзел возьмуць: аўтары праекту Марыя Мартысевіч, Дар'я Сітнікава і Максім Жбанкоў, фатограф Андрэй Шчукін, а таксама ўдзельнікі праекту — паэт Віталь Рыжкоў і літаратар Севярын Квяткоўскі.

Акрэдытацыя для журналістаў на прэс-канфэрэнцыю паводле папярэдняга запісу да 12.00 16 чэрвеня:

maryjka.m@gmail.com, +37529 640-46-79 (Марыя Мартысевіч)
avakintis@gmail.com, +37529 673-35-02 (Дар'я Сітнікава)

Валянцін Акудовіч, Віктар Шалкевіч, Андрэй Хадановіч, Лявон Вольскі, Віталь Рыжкоў, Сяргей «Пістончык» Прылуцкі і інш.
у супольным арт-праекце для альманаха pARTisan

**КАНЕЦ СЛОВАЎ**

«вечны» каляндар аголеных беларускіх літаратараў

Прэм'ера-прэзентацыя праекту адбудзецца **19 чэрвеня (пятніца) а 18:00** у бар-клубе «6А» (Партызанскі праспект, 6А)

У прграме: дзявочы слэм, эратычны аўкцыён, паэтычнае караоке

Музыка: Андрэй Такінданг, Сяргей Пукст
Словы і дзеянні: Віктар Шалкевіч
Уваход вольны

Увага! Толькі падчас івэнту!
Спецыяльныя кошты на каляндар і дадатковую прадукцыю




Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 12.06.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.